У ВОЙСКА – ПА ПРАФЕСІЮ 5

ЛЮСТРАНЫ СВЕТ СЯРГЕЯ ЛАБКОВА 11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

24 ЖНІЎНЯ 2019 г. СУБОТА № 160 (29027)

ЦЫТАТА ДНЯ

Роберт ЧАСНОЙЦЬ, старшыня Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя:

«Пры распрацоўцы новай сістэмы аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый аховы здароўя ставілася задача спрасціць дзеючую. Наспела неабходнасць зрабіць яе больш простай і празрыстай. Разам з тым трэба было захаваць дыферэнцыраваную аплату працы медработнікаў у залежнасці ад умоў, складанасці і напружанасці. Новая сістэма аплаты працы для работнікаў галіны справядлівая. У ахове здароўя немагчыма ўстанавіць здзельную аплату, як, напрыклад, на заводзе. Урач атрымлівае зарплату незалежна ад таго, колькі пацыентаў ён прыняў — 20 ці 40. Цяпер мы пераходзім да новых метадаў, дзе аплата працы будзе і залежаць ад колькасці прынятых пацыентаў, і фарміравацца з улікам адпаведных даплат. Кіраўнікі атрымаюць большую свабоду ў прэміраванні за звышнарматыўную работу».

КАРАТКА

• **Дзяржзаказ па збожжы ў Мінскай вобласці выкананы на 100 %, у Брэсцкай і Гродзенскай — на 95 %.**

• Мінабароны заяўляе, што абнаўленне заканадаўства дазволіць павялічыць прызыў у войска на тры тысячы чалавек.

• **Дар'і Домрачавай уручылі Малы хрустальны глобус у гонцы праследавання сезона 2014/2015.**

ISSN 1990 - 763X

Вытокі малой радзімы

ЗАВОД І ЛЁЗНЕНСКІЯ СТРОІ

Гэтым разам рубрыка «Вытокі малой радзімы» рушыць у Лёзненскі раён, дзе нядаўна адрадзілі крыніцу пад назвай Завод. Адкуль такая незвычайная назва, спытаеце вы? Справа ў тым, што да вайны каля вёскі Емельянова існаваў ільнозавод, а на яго двары струменіла крыніца чысцюткай і халоднай вады. Падчас вайны завод быў знішчаны, таксама згарэў і рабочы пасёлак. Паколькі пазней вытворчасць не аднавілі, крыніца стала зарастаць і нібыта знікла. Паступова наваколле змяніла свой выгляд, але тым не менш людзі старэйшага веку памяталі крыніцу і па-ранейшаму называлі гэтыя мясціны Заводам. І вось тры гады таму загадчыца клуба-бібліятэкі і старэйшына вёсак Емельянова, Залессе, Шавялі і Лапіна Алена Саладкова пры ўдзеле мясцовай моладзі вырашыла аднавіць святыню — адкапалі драўляны стогадовы зруб, паставілі над ім дахоўку, збудавалі прыступкі і зрабілі месца для адпачынку. Потым паставілі і памятны крыж. Завод зноў стаў «дзейнічаць»!

Менавіта сюды — да Завода — прыехалі рукадзельніцы Лёзненскага Дома рамёстваў у строях лёзненска-руднянскага этнаграфічнага рэгіёна — дырэктар Іна САМУСЕНКА (на фота справа) і майстар-метадыст па ткацтве Алена РАЖКО, каб прадэманстраваць свае новыя аўтэнтычныя творы, зробленыя ўвішнымі рукамі. Дваццаць гадоў таму гэтыя апантаныя рамесніцы захапіліся ідэяй адрадзіць святочную жаночую адзежу, пачалі шукаць адпаведныя рарытэты, назапашваць звесткі пра рэгіянальны строй, паралельна засвойвалі тэхналогію набівання малюнкаў на тканіну (у канцы XIX – пачатку XX стагоддзя «набойка» была распаўсюджана), прафесійна асвоілі і паліхромную вышыўку. Рэканструяваныя строі (а іх у Доме рамёстваў ужо болей за два дзясяткі камплектаў) красамоўна сведчаць, як урачыста і святочна выглядалі жанчыны ў вёсках і мястэчках на віцебска-смаленскім памежжы ў тыя далёкія часы.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Спецыяльны рэпартаж

МЕСЦА ВЕРЫ

«Звязда» даведалася, чым жыве сёння і з якой спадчынай падыходзіць да 500-гадовага юбілею Жыровіцкі Свята-Успенскі манастыр

Навошта жывеш, чалавек?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У будні дзень Жыровічы, ці, як кажуць тутэйшыя на стары лад, — Жыровіцы, мала чым адрозніваюцца ад любой іншай беларускай вёскі. Нетаропкі рух на вуліцах, клопаты на гародзе і ў хляве, дзеці на веласіпедах. Нават на манастырскіх сцежках нешматлюдна — пара-тройка выпадковых турыстаў і рабочыя. Калі ўваходзіш у вялізны Успенскі сабор, чуеш рэха ўласных крокаў.

— Вам пашанцавала, — кажа іераманах Яўстафій, з якім знаёмлюся ў першыя хвіліны ў манастыры. — У нядзелю і на святы тут ні прайсці ні праехаць. Да цудадзейнай іконы і крыніц — чарга, а экскурсіі па тэрыторыі не спыняюцца з ранку да вечара. Лавіце момант спакою ў адной з самых вядомых абіцеляў Беларусі.

СТАР. 13

Будзьце здаровыя!

ПА ПРЫНЦЫПЕ САМАДАСТАТКОВАСЦІ

Як арганізавана медыцынская дапамога ў самым аддаленым ад абласнога цэнтра раёне краіны

У 2020 годзе ў Беларусі ўрачы агульнай практыкі цалкам заменяць участковых тэрапеўтаў. Пастаўскі раён стаў адным з першых, дзе ўкаранялася і тэсціравалася гэта сістэма. Як арганізавана медыцынская дапамога ў самым аддаленым ад абласнога цэнтра раёне, чым тут утрымліваюць маладых спецыялістаў (а за апошні час усе шэсць маладых урачоў, у якіх скончылася размеркаванне, падоўжылі кантракт)? У чым сакрэт рэгіёна, які лічыцца рэкардсменам па колькасці доўгажыхароў? І нарэшце, як бальніца «ўжываецца» з помнікам архітэктуры другой паловы XVIII стагоддзя — палацам Тызенгаўза, у якім размешчаны і музей, і аддзяленне стацыянара? Пра гэта мы даведаліся, пабываўшы ў Паставах.

СТАР. 7

Эканамічная інтэграцыя і заробкі беларусаў

сталі прадметам размовы кіраўніка дзяржавы з прэм'ер-міністрам Сяргеем Румасам

«Хацеў бы абмеркаваць шэраг пытанняў прынцыповага характару з улікам праведзеных інтэграцыйных мерапрыемстваў на ўзроўні ўрадаў постсавецкіх дзяржаў, — сказаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. — Калі паглядзець пад гэтым вуглом, якая ў нас цяпер абстаноўка з Расійскай Федэрацыяй? Вядома ж, маючы той комплекс пытанняў і праблем, якія засталіся, няхай іх нават няшмат, пасля нашай сустрэчы ў Санкт-Пецярбургу з Уладзімірам Уладзіміравічам Пуціным... Якая зараз сітуацыя, абстаноўка? Ці дапрацаваныя тыя пытанні, якія заставаліся? І на чым цяпер спатыкаемся ў беларуска-расійскіх адносінах? Гэта галоўнае пытанне».

Закрануў Прэзідэнт пытанні эканамічнага супрацоўніцтва і з іншымі постсавецкімі краінамі. «Вось з прэм'ерам Грузіі сустракаліся, вам ён, напэўна, таксама пра гэта скажа: у нас з лагістыкай праз Украіну — пастаўка нашых тавараў у Закаўказзе — не вельмі ладзіцца. Напэўна, гэта нашы недапрацоўкі, бо наўрад ці Украіна будзе перашкаджаць гандлю — ім таксама выгадна, гэта транзітная для нас краіна», — сказаў ён.

«Я гатовы абмеркаваць шэраг іншых пытанняў, якія ў вас ёсць», — дадаў Прэзідэнт.

Сяргей Румас распачаў размову з кароткага даклада аб рабоце эканомікі краіны.

«Сёння сітуацыя ў эканоміцы збалансаваная, выконваецца большасць якасных паказчыкаў, — далажыў ён. — Стабільная сітуацыя на грашовым рынку, на фінансавым, на валютным. Інфляцыя знаходзіцца ў запланаваных межах. Мы сёння атрымалі лічбы па заробках. Заробкі растуць, і лічба па ліпені — 1128 рублёў. Сярэдні заробак (з пачатку года. — **«Зв.»**) нарастаючым тэмпам ужо — 1055. Гэта крыху вышэй за тыя параметры, якія плануе урад. І, адпаведна, гэта на нас накладае дадатковыя абавязкі па пошуку сродкаў, каб заробкі бюджэтнікаў, пенсіі трымаліся на ўстаноўленых вамі ўзроўнях: 80 працэнтаў і 40 працэнтаў ад сярэдняга заробку (па краіне. — **«Зв.»**)».

На гэта Прэзідэнт напомніў: «Але мы з вамі дамаўляліся нізкааплатных падымаць, сацыяльную сферу, адукацыю, ахову здароўя... Нянечкі, работнікі нізкага звяна — трэба іх падтрымліваць».

«Сёння асноўны ўпор у дзейнасці ўрада якраз на тое, каб нізкааплатныя катэгорыі атрымлівалі належную заработную плату», — адказаў прэм'ер-міністр.

***

Урад вывучыць сітуацыю на прадпрыемствах з сярэднім заробкам, ніжэйшым за 500 рублёў, паведаміў пасля журналістам Сяргей Румас.

«Цяпер першы віцэ-прэм'ер Аляксандр Турчын курыруе гэтую работу, з другога паўгоддзя мы пачынаем прадметна займацца колам прадпрыемстваў, якія трапляюць у гэтую катэгорыю», — сказаў ён.

«Урад практычна дамогся выніку, што ў краіне няма прадпрыемстваў, сярэдняя зарплата на якіх была б ніжэйшай за 400 рублёў. Ёсць некалькі прадпрыемстваў, якія мы ведаем пайменна і разумеем прычыны, чаму гэта атрымалася», — дадаў прэм'ер-міністр.

Сяргей Румас звярнуў увагу, што, з аднаго боку, рост заработнай платы нельга не вітаць, таму што павышаецца ўзровень дабрабыту грамадзян, прычым павышэнне заробкаў адбываецца пры ўмове стабільнай работы эканомікі ў цэлым, спакойнай сітуацыі на валютным рынку. Разам з тым урад не можа не турбаваць, што рост прадукцыйнасці працы адстае ад росту заробкаў. «Гэтая тэма знаходзіцца ў нас на кантролі. Мы працуем з галінамі, з канкрэтнымі прадпрыемствамі, таму што гэта ў першую чаргу датычыцца дзяржаўных прадпрыемстваў, каб пазбегнуць дысбалансу і каб прадукцыйнасць працы не адставала ад росту заробкаў», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Што датычыцца Саюзнай дзяржавы, то Беларусь і Расія могуць парафіраваць (папярэдне падпісаць) праграму дзеянняў па інтэграцыі ў верасні, заявіў прэм'ер-міністр.

«Прэзідэнту далажылі, што рабочая група і затым прэм'еры цалкам адпрацавалі праграму дзеянняў па рэалізацыі палажэнняў саюзнага дагавора і гатовыя яе парафіраваць. Гэтая праграма налічвае 66 пунктаў, яны практычна ўсе ўзгодненыя, з кіраўніком дзяржавы патрабавалася ўдакладненне асобных момантаў, — патлумачыў Сяргей Румас. — Ва ўрада ёсць поўная яснасць па гэтых палажэннях. Дагавор ахоплівае ўсе сферы эканомікі, сацыяльныя пытанні і накіраваны на далейшае паглыбленне інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй».

Пасля парафіравання тэкст праграмы будзе апублікаваны. «Каб грамадскасць магла азнаёміцца з ім і зняць нейкія апасенні, якія ёсць сёння ў прэсе з нагоды зместу гэтай праграмы дзеянняў», — сказаў Сяргей Румас.

У праграме дзеянняў закладзена канцэпцыя, якая прадугледжвае выкананне прынцыпу «дзве краіны — адзін рынак». Па гэтай праграме будзе распрацавана каля 28 дарожных карт. Яны павінны быць падрыхтаваны да 1 лістапада, сказаў Сяргей Румас. «Дарожныя карты будуць прадугледжваць пералік мер па стварэнні агульных рынкаў у галінах эканомікі. Для суб'ектаў гаспадарання гэтая праграма ў першую чаргу азначае роўныя ўмовы — прычым не толькі па энерганосьбітах, але і па падатковай нагрузцы, роўныя рэгулятарныя патрабаванні», — растлумачыў ён. Гэта трэба, каб прадпрыемствы маглі на агульным рынку, які ствараецца, канкураваць у роўных умовах.

Кіраўнік дзяржавы быў таксама праінфармаваны аб выніках апошняга Еўразійскага міжурадсавета ў Кыргызстане. У прыватнасці, там чарговы раз разглядаліся пытанні аб адзіным алкагольным рынку ЕАЭС і размеркаванні ўвазных мытных пошлін паміж бюджэтамі краін еўразійскай пяцёркі. Па гэтых пытаннях кіраўніку дзяржавы была паведамлена пазіцыя ўрада. Прэзідэнт ухваліў частку падыходаў, па частцы пытанняў урад дасць дадатковую інфармацыю для прыняцця адпаведных рашэнняў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

БАЧНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з прэм'ер-міністрам Грузіі Мамукам Бахтадзэ

Задача давесці тавараабарот паміж краінамі да 200 мільёнаў долараў была пастаўлена кіраўнікамі дзвюх дзяржаў яшчэ ў 2015 годзе, падчас першага візіту Прэзідэнта Беларусі ў Грузію. Пакуль мэта не дасягнутая, тым не менш ёсць падставы гэтага чакаць, запэўніў беларускага лідара кіраўнік грузінскага ўрада ўчора падчас сустрэчы ў Палацы Незалежнасці ў Мінску.

І адна з галоўных умоў — асаблівыя стасункі паміж двума народамі. Менавіта на гэта звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. «Што датычыцца нашых адносін, я заўсёды прыводжу ў прыклад наша супрацоўніцтва, — сказаў ён грузінскаму госцю. — Няхай у нас каля 100 мільёнаў тавараабарот, тым не менш мы пачыналі некалі з нуля і ўявіць не маглі, як можна гандляваць з Грузіяй у сувязі з праблемай у Грузіі з Расійскай Федэрацыяй і іншымі пытаннямі. Аднак літаральна за некалькі гадоў мы навучыліся гандляваць, мы бачым перспектывы».

Аляксандр Лукашэнка дадаў: «Адносіны нашых людзей да грузінаў вы ведаеце. Гэта блізкія нам людзі, якіх нямала жыве ў нас. Святы, якія вы праводзіце на беларускай зямлі, — у кожнай вёсачцы ведаюць грузінскую гасціннасць».

Кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь супрацоўнічае з усімі постсавецкімі краінамі. «Мы іх не дзелім на дрэнныя і добрыя. І, думаю, калі нават і ёсць нейкія недахопы, праблемы ў супрацоўніцтве, іх трэба пераадольваць. Спакойна, цярпліва, што мы і робім з некаторымі дзяржавамі паслясавецкага перыяду. Вы ў гэтым плане можаце разлічваць на тое, што мы настойліва, цярпліва (хоць гэта ўжо не трэба — мы гэты перыяд прайшлі) будзем развіваць нашы адносіны на карысць беларускага і грузінскага народаў», — запэўніў беларускі лідар.

У адказ Мамука Бахтадзэ сказаў, што для яго вялікі гонар быць на беларускай зямлі ў якасці прэм'ер-міністра Грузіі. «Калі я працаваў у прыватным сектары, потым кіраваў грузінскай чыгункай, у мяне была прывілея часта тут бываць, таму я сам асабіста ведаю, якія цёплыя адносіны паміж нашымі народамі», — пагадзіўся ён.

На думку грузінскага прэм'ер-міністра, краіны змогуць падвоіць узаемны тавараабарот. «З 2015 года, калі адбыўся ваш першы візіт у Грузію, развіццё нашых адносін атрымала вялізны стымул», — аргументаваў ён.

Мамука Бахтадзэ падзякаваў Аляксандру Лукашэнку і беларускаму народу за рынцыповую падтрымку тэрытарыяльнай цэласнасці і суверэнітэту Грузіі. «Грузінскі народ гэтага ніколі не забудзе», — сказаў ён.

У тэму:

Днямі ў Мінску па вуліцы Куйбышава, 48 адкрыўся культурна-эканамічны цэнтр «Грузінскі дом».

Праект рэалізаваны пры падтрымцы ўрада Беларусі. «Грузінскі дом» стане новай платформай для гандлёвых, эканамічных і культурных сувязяў паміж дзвюма краінамі, — паведамляе PR-менеджар праекта Вікторыя Сачыўка. — Ён створаны для садзейнічання экспарту натуральных прадуктаў з Грузіі, паглыбленне дзелавых адносін паміж грузінскімі і беларускімі дзелавымі коламі, а таксама для папулярызацыі грузінскіх традыцый, гісторыі і культуры».

У «Грузінскім доме» размясціліся музей віна з энатэкай (калекцыяй він) і ўнікальнымі экспанатамі, якія адлюстроўваюць 8000-гадовую гісторыю грузінскага вінаробства; выставачныя, канферэнцыйная і прэзентацыйная прасторы; крама віна і натуральных грузінскіх прадуктаў; грузінскі рэстаран; вінны склеп і пякарня.

«Гэта наша прынцыповая пазіцыя ў адносінах да любой дзяржавы», — адказаў Прэзідэнт Беларусі.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

НЕ ТОЛЬКІ ГАНДАЛЬ

У адносінах з Грузіяй важна задзейнічаць усе сферы. Пра гэта казаў на сустрэчы з кіраўніком грузінскага ўрада старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.

«Наша прынцыповая пазіцыя — шукаць магчымасці для нарошчвання супрацоўніцтва па ўсіх кірунках, якія выгадныя і беларускаму боку, і грузінскаму. Важную ролю ў гэтым адыгрываюць парламентарыі, — сказаў Уладзімір Андрэйчанка. — У нас створаны групы дружбы. Трэба сказаць, што яны працуюць нефармальна. Падрыхтавана дарожная карта развіцця супрацоўніцтва паміж парламентарыямі. Яна цяпер знаходзіцца на разглядзе ў грузінскага боку. Думаю, што парламентарыям трэба больш грунтоўна працаваць і ў складзе міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, таму што асноўныя пытанні вырашаюцца менавіта там».

Паводле слоў спікера ніжняй палаты беларускага парламента, ёсць усе перадумовы для нарошчвання двухбаковага тавараабароту. «Нам трэба далей ісці па шляху стварэння сумесных прадпрыемстваў па перапрацоўцы вашай прадукцыі, агародніны, садавіны на тэрыторыі Беларусі», — адзначыў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Уладзімір Андрэйчанка акцэнтаваў асаблівую ўвагу на развіцці турызму паміж Беларуссю і Грузіяй. Па звестках статыстыкі, калі ў 2010 годзе прыкладна пяць тысяч беларусаў наведала Грузію, то ў 2018-м — ужо 65 тысяч. «Думаю, што турыстычны кірунак трэба развіваць не толькі ў Грузію, але каб і ў Беларусь прыязджалі. І гэта не толькі пазнавальны, але і медыцынскі турызм. У нас добра развіта медыцына. Каля 120 студэнтаў з Грузіі навучаюцца ў нашых медыцынскіх установах. Мы гатовыя прыняць больш, у тым ліку ва ўстановы сельскагаспадарчага, эканамічнага профілю. Нашы вышэйшыя навучальныя ўстановы даюць добрую адукацыю і каціруюцца на сусветным узроўні», — падкрэсліў ён.

«У нас дынаміка вельмі пазітыўная, — пагадзіўся Мамука Бахтадзэ. — Беларусь для Грузіі з'яўляецца важным і надзейным партнёрам. З задавальненнем хачу адзначыць, што беларуская прадукцыя карыстаецца вялікай папулярнасцю ў нашага насельніцтва. У іншых сектарах эканомікі таксама ідзе добрая кааперацыя. Для нас важны ваш вопыт развіцця новых тэхналогій, інавацый».

Кажучы аб актывізацыі супрацоўніцтва ў галіне турызму, Мамука Бахтадзэ адзначыў, што, калі «ёсць моцныя, надзейныя адносіны паміж народамі, заўсёды можна выбудаваць любыя мадэлі эканамічнага супрацоўніцтва».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ЯК ПАДВОІЦЬ ТАВАРААБАРОТ

Пра гэта ўчора ішла размова на сустрэчы прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Румаса з прэм'ер-міністрам Грузіі Мамукам Бахтадзэ.

«Краіны маюць вялікія магчымасці ў гандлі адно з адной як таварамі, так і паслугамі. Лічба, якая абмяркоўваецца, — 200 мільёнаў долараў, гэта бліжэйшая задача. З другога боку, яна таксама не з'яўляецца нейкай мяжой або непераадольнай лічбай», — сказаў Сяргей Румас.

Паводле яго слоў, Беларусь гатова развіваць з Грузіяй прамысловую і сельскагаспадарчую кааперацыю. Пілотныя праекты ў гэтых сферах ужо рэалізуюцца. «Беларусь мае развітое машынабудаванне, і мы бачым, што беларускія прадпрыемствы гатовы цалкам задаволіць патрэбы грузінскіх аграрыяў у сучаснай тэхніцы, навясным абсталяванні. Прычым мы гатовыя адаптаваць тэхніку да ўмоў горнай Грузіі», — дадаў Сяргей Румас. Грузію можа зацікавіць і электратранспарт.

«Беларусь выступае за развіццё шматпланавых адносін з Грузіяй, якая з'яўляецца для нас не толькі надзейным партнёрам, але і брацкай дзяржавай», — рэзюмаваў беларускі прэм'ер-міністр.

У сваю чаргу, Мамука Бахтадзэ падкрэсліў, што ў апошнія гады адносіны Грузіі і Беларусі знаходзяцца на вельмі высокім узроўні. «Гандлёва-эканамічныя адносіны выходзяць на новыя пазіцыі», — сказаў ён. Прэм'ер-міністр Грузіі таксама адзначыў пазітыўную дынаміку развіцця культурнага супрацоўніцтва.

Паводле БелТА.

Мясцовая ўлада павінна быць бліжэйшай да людзей

На гэтым акцэнтавала ўвагу кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА, якая прыняла ўдзел у пасяджэнні Вілейскага райвыканкама, падчас якога разглядаліся пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна.

Фота БелТА.

Перш за ўсё кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта пацікавілася, якія пункты росту Вілейскага раёна бачаць мясцовыя ўлады. Бо пакуль ёсць праблемы з выкананнем паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця за паўгода, і гэта пры багатым патэнцыяле. «Датацыйнасць раёна памяншаецца, цяпер складае 43 %. Гэта адзін з ключавых паказчыкаў развіцця і ацэнкі эфектыўнасці работы мясцовых органаў улады. Чарговы раз нагадваю: чалавек на чале ўсяго. Калі эканоміка эфектыўна працуе — ёсць магчымасць напаўняць бюджэт і вырашаць сацыяльныя пытанні, — сказала Наталля Качанава. — Нядобра, што такі прыгожы раён — я тут упершыню — не выконвае паказчыкі. Бо з лічбаў складаецца жыццё. Трэба глыбей разглядаць перспектывы росту. Ужо сёння павінны быць напрацоўкі. У вас гэта прыцягненне прамых замежных інвестыцый, трэба яшчэ падцягваць экспарт паслуг. Яны і турызм павінны займаць большы сегмент, у Вілейскім раёне ўсё для гэтага ёсць. Выкарыстоўвайце гэты патэнцыял».

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта выказала занепакоенасць нізкай зарплатай у АПК раёна, а таксама колькасцю стратных прадпрыемстваў, асабліва ў сельскай гаспадарцы. «Трэба выпраўляцца, — адзначыла яна. — І трэба кадрамі ўмацоўваць сельгаспрадпрыемства. Ёсць жа прыклады, калі пры роўных эканамічных умовах арганізацыі працуюць па-рознаму. Так што падбор і расстаноўка кадраў — асноўная задача».

«Трэба займацца стратнымі прадпрыемствамі, не запускаць. Калі бачыце, што ёсць станоўчая дынаміка, трэба прымаць меры. За гэтым нашы людзі, іх дабрабыт», — падкрэсліла Наталля Качанава. Яна звярнула ўвагу на тое, што да гэтай работы неабходна больш актыўна прыцягваць і прадстаўнікоў абласной улады, і рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання — калі гаворка ідзе пра прадпрыемствы адпаведнай формы ўласнасці.

У лік стратных трапілі і абедзве будаўнічыя арганізацыі — на ПМК-185 працуе 51 чалавек, сярэдняя зарплата ў іх — Br470, на ПМК-88 — 87 чалавек, сярэдняя зарплата — Br511. «Намесніку старшыні аблвыканкама гэтую праблему даручана ўзяць на кантроль. ПМК павінны працаваць эфектыўна і выконваць аб'ёмы», — сказала Наталля Качанава.

«Вы павінны за гэтыя два гады выканаць задачу па забеспячэнні шматдзетных, якія даўно стаяць у чарзе, жыллём. А з 2021 года мы павінны выразна ўвайсці ў графік — запрашаць да будаўніцтва на працягу года з моманту пастаноўкі на чаргу. Кожную шматдзетную сям'ю трэба трымаць на кантролі», — падкрэсліла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Падсумоўваючы сустрэчу, Наталля Качанава падкрэсліла, што прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта рэгулярна выязджаюць у рэгіёны, кантралюючы выкананне даручэнняў кіраўніка дзяржавы, работу са зваротамі грамадзян і іншыя пытанні. «Мы наведваем такія пасяджэнні, каб даць ацэнку кадрам, убачыць, як развіваецца рэгіён, якія ёсць праблемы і перспектывы. Магчыма, недзе падставіць плячо, — сказала Наталля Качанава. — Я ўбачыла, што тут новая каманда — гэта накладае адбітак: пайшлі станоўчыя зрухі. Думаю, па выніках года сітуацыя палепшыцца, і гэта будзе рэальнае выкананне пастаўленых задач».

Паказальнай з'яўляецца колькасць зваротаў грамадзян Вілейскага раёна — у Адміністрацыю Прэзідэнта паступіла 32 звароты, у аблвыканкам — больш за 100, 266 зваротаў накіраваныя непасрэдна ў райвыканкам. «Гэта правільна. Людзі павінны атрымліваць дапамогу і падтрымку ў мясцовай вертыкалі, якая фармуе імідж улады ўсёй краіны. Ключавое — работа з насельніцтвам, давядзенне да людзей праўдзівай інфармацыі. Трэба паважаць і шанаваць кожнага чалавека. І памятайце, што тры задачы — цэны, зарплаты, занятасць — перш за ўсё. З дабрабыту кожнага грамадзяніна складаецца дабрабыт краіны ў цэлым», — рэзюмавала кіраўнік Адміністрацыі.

Паводле БелТА.

НОВЫЯ ІМПУЛЬСЫ БРЭСТЧЫНЫ

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС сустрэўся з журналістамі рэспубліканскіх, абласных і раённых сродкаў масавай інфармацыі, інтэрнэт-выданняў, каб расказаць пра вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Брэстчыны сёлета ў І паўгоддзі, а таксама пра асноўныя мерапрыемствы, якія адбудуцца ў рэгіёне ў жніўні — снежні.

Фота БелТА.

У прыватнасці, старшыня аблвыканкама закрануў тэму будаўніцтва ў абласным цэнтры акумулятарнага завода, якая актыўна абмяркоўваецца. Анатоль Ліс сказаў, што Брэсцкі аблвыканкам запатрабаваў ад ТАА «АйПаўэр» вярнуць узятыя ў інавацыйным фондзе сродкі на будаўніцтва акумулятарнага завода. Згодна з умовамі дагавора, заключанага з «АйПауэр» на выдзяленне сродкаў інавацыйнага фонду Брэсцкага аблвыканкама па рэалізацыі і фінансаванні праекта, прадпрыемства павінна было ажыццявіць увод у эксплуатацыю акумулятарнага завода да 31 ліпеня 2019 года. У адваротным выпадку сродкі, выкарыстаныя арганізацыяй паводле дагавора, павінны быць вернутыя.

«2 жніўня аблвыканкам зрабіў запыт аб ходзе завяршэння рэалізацыі праекта. Паколькі кампанія не выканала свае абавязацельствы па дагаворы (праект не быў рэалізаваны ў названы тэрмін), аблвыканкам адмовіўся ад выканання сваіх абавязацельстваў, 14 жніўня апавясціў «АйПаўэр» аб спыненні дамовы і запатрабаваў вярнуць сродкі ў інавацыйны фонд у добраахвотным парадку на працягу месяца з даты паведамлення», — сказаў Анатоль Ліс.

Ён адзначыў, што пытанне будаўніцтва акумулятарнага завода знаходзіцца на кантролі не толькі мясцовых, але і рэспубліканскіх органаў кіравання, у тым ліку Савета Міністраў, Адміністрацыі Прэзідэнта. «Завод з парушэннем экалагічных, іншых нормаў, якія існуюць у Беларусі, уведзены не будзе. Тут іншага быць не можа. Такая пазіцыя агульная, яна выпрацавана», — падкрэсліў губернатар.

Адназгалоўныхтэмнасённяніндзень — ход уборачнай. Па словах старшыні аблвыканкама, вобласць плануе сабраць за 1,2 мільёна тон збожжа (з улікам проса і грэчкі). Масавая ўборка ранніх збожжавых і зернебабовых культур у рэгіёне завершана, засталося сабраць хлеб на 0,7 % пасяўных плошчаў. «Валавы збор збожжа ўжо склаў 1196 тысяч тон. Будзе 1200 тысяч тон. Гэты паказчык вышэйшы ў параўнанні з леташнім прыблізна на 28 %. Значна вышэйшая і ўраджайнасць — 35,5 цэнтнера з гектара. Мы на другім месцы пасля Гродзенскай вобласці. Па намалоце таксама другія ў краіне — пасля Мінскай вобласці», — адзначыў Анатоль Ліс.

Гаворачы пра развіццё турыстычнай галіны, старшыня аблвыканкама асабліва падкрэсліў, што паток бязвізавых турыстаў у Брэсцкую вобласць за год вырас амаль удвая.

«За ўвесь тэрмін дзеяння бязвізу ў вобласці пабывала 38 тысяч замежных гасцей, даход ад наведвання якіх склаў $2 млн. Сёлета мы бачым павелічэнне патоку амаль у два разы ў параўнанні з аналагічным перыядам 2018-га», — сказаў Анатоль Ліс. Новы імпульс уязному турызму закліканы даць указ № 300, які аб'яднаў бязвізавыя зоны Брэсцкай і Гродзенскай абласцей у адну.

Павелічэнне турыстычнага патоку губернатар звязвае з 1000-годдзем Брэста. На яго думку, замежнікаў у першую чаргу прыцягвае так званы падзейны турызм — народныя святы, спартыўныя спаборніцтвы, фестывалі. Таксама многія прыродныя аб'екты рэгіёна лічацца эксклюзіўнымі ў Еўропе, дзе папулярны экалагічны і іншыя актыўныя віды турызму. Акрамя Белавежскай пушчы і Прыпяцкага Палесся, у вобласці больш за 50 заказнікаў, стварауюцца турыстычныя стаянкі, у тым ліку для караванераў, добраўпарадкавана каля 60 экалагічных веламаршрутаў.

У аграгурызме развіваецца новая, кластарная форма, якая аб'яднала аграсядзібы і суб'екты туріндустрыі шасці раёнаў у адзіны турыстычны «прадукт».

Анатоль Ліс адзначыў, што турыстычная інфраструктура вобласці дазваляе з камфортам сустракаць і размяшчаць гасцей. У сярэднім за год рэгіён наведваюць больш за 800 тысяч турыстаў, з якіх 280 тысяч з замежжа. На экспарце турпаслуг летась рэгіён зарабіў $14,9 млн.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Пуцін даручыў прапрацаваць сіметрычны адказ на выпрабаванне ЗША новай крылатай ракеты

«Маючы на ўвазе абставіны, якія складваюцца ў сувязі з выпрабаваннямі Злучанымі Штатамі новых крылатых ракет, даручаю Міністэрству абароны, Міністэрству замежных спраў, іншым профільным ведамствам прааналізаваць узровень пагрозы, створанай гэтымі дзеяннямі Злучаных Штатаў для нашай краіны, і прыняць вычарпальныя меры па падрыхтоўцы сіметрычнага адказу», — заявіў кіраўнік расійскай дзяржавы. Разам з тым, паводле слоў Пуціна, «Расія па-ранейшаму адкрытая да раўнапраўнага і канструктыўнага дыялогу са Злучанымі Штатамі Амерыкі для аднаўлення даверу і ўмацавання міжнароднай бяспекі». Прэзідэнт Расіі заявіў, што Масква не стане ўцягвацца ў затратную гонку ўзбраенняў, нягледзячы на дзеянні ЗША.

Пуцін нагадаў, што выпрабаваная Злучанымі Штатамі 18 жніўня крылатая ракета наземнага базіравання, якая, па заяве амерыканскага ваеннага ведамства, параліза цэль на адлегласці звыш 500 кіламетраў, адносіцца да катэгорыі забароненай ДРСМД зброі.

Улады Бразіліі стварылі крызісны штаб у сувязі з пажарамі ў Амазоніі

Прэзідэнт Бразіліі Жаір Балсанару распарадзіўся стварыць крызісны штаб у сувязі з пажарамі ў бразільскай Амазоніі. Гэта рашэнне было прынята на экстраннай нарадзе ў кіраўніка дзяржавы, паведаміў тэлеканал Record TV. Па выніках сустрэчы з ключавымі міністрамі, а таксама членамі сваёй адміністрацыі Балсанару даў даручэнне ўсім міністэрствам у рамках сваіх кампетэнцый прадставіць прапановы па вырашэнні крызіснай сітуацыі з «нацыянальным здабыткам». Па апошніх звестках бразільскага Нацыянальнага інстытута касмічных даследаванняў, са студзеня да жніўня пажары знішчылі амаль 2 мільёны гектараў лясоў Амазоніі, размешчаных на тэрыторыі найбуйнейшай паўднёваамерыканскай краіны. Агульная колькасць зафіксаваных спадарожнікамі ачагоў узгарання ў краіне ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года вырасла на 85 %. На фоне распаўсюджвання пажараў у бразільскім грамадстве рэзка абвастрылася крытыка на адрас прэзідэнта і ўрада ў сувязі з тым, што яны не аддаюць дастаткова ўвагі ахове навакольнага асяроддзя. Балсанару заявіў, што ва ўлад няма рэсурсаў для барацьбы з пажарамі ў Амазоніі.

Раскосмас пакуль не бачыць ніякіх пагроз Зямлі з космасу

Кіраўнік Раскосмасу Дзмітрый Рагозін назваў «страшылкамі» чарговыя чаканні канца свету і запэўніў, што актуальных касмічных пагроз на гэты момант няма. «Страшылак вельмі шмат, але сістэмы касмічнага маніторынгу Раскосмасу пакуль не бачаць ніякіх пагроз Зямлі, якія маглі б быць», — сказаў Рагозін на сустрэчы з удзельнікамі форуму «Машук», адказваючы на пытанне адной з удзельніц пра пагрозу канца свету ў верасні. Пры гэтым Рагозін не выключыў з'яўлення падобных пагроз у будучыні. «Але пакуль усё спакойна», — удакладніў кіраўнік Раскосмасу. Раней у прэс-службе Раскосмасу паведамлялі, што астэроід 2019 OU1, які набліжаецца да Зямлі, не ўяўляе небяспекі для планеты і чалавецтва. Максімальнае збліжэнне касмічнага аб'екта з Зямлёй адбудзецца 28 жніўня 2019 года і складзе каля 1 мільёна кіламетраў.

Як нас дураць...

Адмяняла пакупкі і забірала грошы сабе

Праваахоўнікі раскрылі злачынную схему касіра аднаго са сталічных магазінаў.

Як паведаміла **супрацоўнік аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама Дар'я БАБОК,** аператыўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Кастрычніцкага РУУС сталіцы ўстанавілі, што не ў меру прадпрымальная жанчына-касір аднаго з магазінаў бытавой хіміі самастойна прызначыла сабе надбаўку да зарплаты.

Асаблівасцю работы магазіна, у якім працавала фігурантка, з'яўлялася тое, што ва ўсіх касіраў меўся бесперашкодны доступ да карткі, з дапамогай якой можна адмяніць ужо «прабіты» на касе тавар. Чым, уласна, і скарысталася жанчына. Яна брала грошы за тавар і ўдакладняла, ці патрэбны чэк. Паколькі ў большасці выпадкаў грамадзяне адмаўляліся, жанчына да абслугоўвання наступнага кліента праводзіла адмену пакупкі з дапамогай карткі, а грошы забірала сабе.

Такім чынам 36-гадовая мінчанка менш чым за месяц прысвоіла каля 400 рублёў, тым самым нанёсшы шкоду гандлёвай сетцы. Вядома, што жанчына раней прыцягвалася да крымінальнай адказнасці за крадзеж.

На гэты час матэрыялы перададзеныя ў Кастрычніцкі (горада Мінска) раённы аддзел Следчага камітэта для дачы прававой ацэнкі дзеянням фігуранткі.

Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 8 (95)

Формула інжынернага поспеху

РОЛЮ інжынерных войскаў цяжка пераацаніць. Яны прызначаны для таго, каб аблегчыць складанасць і скараціць час выканання баявых задач іншых падраздзяленняў. На Армейскіх гульнях — 2019, якія праходзілі ў першай палове жніўня, беларускія вайскоўцы паказалі другі вынік у конкурсах «Інжынерная формула» і «Бяспечны маршрут». Прычым па выніках першага паўфіналу «Інжынернай формулы» нашы экіпажы былі і ўвогуле найлепшыя. Праходзілі гэтыя спаборніцтвы на палігоне пад расійскай Цюменню. Падрабязнасці расказвае старшы афіцэр штаба кіравання інжынерных войскаў Генеральнага штаба Узброеных Сіл падпалкоўнік Дзяніс ВАСІЛЕВІЧ.

— Падрыхтоўка асабовага складу стартавала яшчэ ў снежні, ад пачатку новага навучальнага года ва Узброеных Сілах. На гэтым этапе мы праводзілі спаборніцтвы паміж падраздзяленнямі і воінскімі часцямі інжынерных войскаў, падчас якіх і былі адабраны па два найлепшыя склады экіпажаў на кожны раўнд «Інжынернай формулы». Пасля гэтага спатрэбіўся яшчэ месяц на канчатковую падрыхтоўку. Усе нашы машыны выконвалі не толькі спецыялізаваныя задачы, але і былі абавязаны праехаць па трасе з перашкодамі. Гэта значыць, пераадолець брод, абмежаваны праход, прайсці «змейкай», спусціцца і падняцца.

Трэцяй перад суддзямі з'явілася машына-пуцеўкладчык. Ён прызначаны для пракладвання калоннай шляху для ваеннай тэхнікі ў выглядзе грунтовай дарогі на выпадак руху па бездарожжы. Акрамя таго, калі з-за дзеянняў праціўніка дарожнае палатно аказалася моцна пашкоджаным, гэтая машына яго зараўняе, яна робіць роўную дарогу. І гэта яшчэ не ўсё — пуцеўкладчык мусіў закапаць катлаван.

Першай стартавала інжынерная машына загароджання. Яна выконвала задачу па ўладкаванні інжынерных загарод, надаўбняў. З дапамогай маніпулятара браліся бярвёны і ставіліся на падрыхтаваныя ячэйкі. За ёй выходзіла машына для выкопвання катлаванаў. Патрабавалася вырыць паглыбленне даўжынёй чатыры метры і глыбінёй да метра. Катлаваны гэтыя выкарыстоўваюцца для таго, каб схаваць, напрыклад, танкі.

За ім з'явіўся гусенічны мінны загараджальнік. Гэтая машына выкарыстоўваецца для ўстаноўкі соцень процітанкавых мін перад пярэднім краем на выпадак прарыву праціўніка. Размяшчацца яны могуць як у зямлі, так і на паверхні грунту. Міны адразу ж пераводзяцца ў баявое становішча і гатовы для выкарыстання. На конкурсе ж дастаткова было закласці 16 мін. За загараджальнікам выязджала ўстаноўка размінравання. Яна прызначана рабіць праходы шырынёй да шасці метраў у мінных палях для таго, каб захоўваць тэмп наступлення. Расія, напрыклад, прадэманстравала эфектыўнасць такой установкі падчас канфлікту ў Сірыі. Больш за тое, выкарыстоўваць гэтую машыну можна і ў грамадзянскіх мэтах падчас тушэння лясных пажараў. Толькі тут машына пракладзе ўжо з дапамогай выбухаў зараду паласу, каб агонь не ішоў па зямлі. Агонь будзе адсечаны і неўзабаве патушаны. З адным, праўда, «але». У нашых рэаліях гэта будзе даволі дорага ў параўнанні з традыцыйнымі метадамі. Адзін пагонны метр шнура вымагае некалькі кілаграмаў пластыту.

Апошнім на дыстанцыю выходзіў экіпаж плавучага транспарцёра. Ён браў на борт аўтамабіль «Урал» ці «Камаз» і адпраўляўся ў заплыў на 150 метраў, агінаў буй і вяртаўся назад. Груз трэба было вярнуць на тое месца, адкуль яго ўзялі.

Натуральна, немагчыма прайсці гонку без штрафных хвілін. Таму арганізатары выбралі цікавы спосаб спрасціць працэс іх падліку. На транспарцёры быў устаноўлены адмысловы таймер. Запускаўся ён толькі пасля таго, як плавучы сродак дасягаў буя. Вымушаны піт-стоп працягваўся, пакуль на таймеры не загараліся адны нулі.

Плавучым транспарцёрам кіраваў **начальнік інжынернай службы 188-й інжынернай брыгады Аляксандр АНЧУК.**

— Адборачны разлік быў сфарміраваны яшчэ ў сакавіку, — кажа ён. — Яшчэ месяц спатрэбіўся на трэніроўкі, якія праходзілі два-тры разы ў тыдзень. Трэніраваліся мы ў сябе дома ў Магілёве куды больш, чым у Цюменскай вобласці Расіі. Самае складанае тут — не плыць, а пагрузіць і выгрузіць аўтамабіль, які мы цягнем. Вага «Урала» перавышае восем тон! Але мы рухаліся не толькі па вадзе. Напрыклад, па сушы наш транспарцёр мусіў пераадолець некалькі перашкод. Гэта вузкакалейны мост, процітанкавы роў, брод, абмежаваны праход, у тым ліку і з паваротам, «змейка», горка... Сакрэт поспеху быў просты. Гэта імкненне як мага больш скараціць час пры захаванні ўсіх мер бяспекі і зладжаныя дзеянні разліку. Мы шмат часу нагналі менавіта па вадзе, паколькі можна было дапамагаць сабе гусеніцамі.

— Наколькі вялікай была канкурэнцыя?

— Гэта ўжо пятыя інжынерныя Гульні, у якіх мы прымаем удзел, — працягвае Дзяніс Васілевіч. — Прычым колькасць дзяржаў расце. Сёлета ўжо было шэсць камандаў — Беларусь, Расія, Манголія, Пакістан, Кітай і Лаос. Прайшлі два паўфіналы. З кожнага з іх у вырашальны раўнд выйшлі па дзве найлепшыя каманды. Прычым наша каманда паказала вельмі годны вынік. Мы ішлі нароўні з Расіяй. А першы паўфінал і наогул выйгралі з істотным запасам па часе. Але вось недзе пасяшаліся і «налавілі» крыху штрафнога часу. Што ж, ёсць над чым працаваць.

— З каго складаліся экіпажы?

— Экіпажы гусенічнай машыны загароджання і ўстаноўкі размінравання, напрыклад, поўнасцю скамплектаваны з салдат тэрміновай службы. Астатнія ж экіпажы былі змешаныя — у іх увайшлі і вайскоўцы-кантрактнікі. А вось, напрыклад, у расіян салдат тэрміновай службы наогул не было.

Да і калі згадаць папярэднюю працэдуру адбору, то ў нас спаборнічалі экіпажы, якія ў Расіі — воінскія часці, падраздзяленні і акругі. Гэта цалкам нармальна, калі зважаць на тое, што армейскія рэсурсы дзвюх краін непараўнальныя. Увогуле, Армейскія гульні — гэта цудоўная база для падрыхтоўкі асабовага складу. А зусім хутка мы адправімся на вучэнні «Шчыт Саюза — 2019», якія пройдуць у верасні.

Начальнік штаба, першы намеснік камандзіра інжынерна-сапёрнага батальёна 2-й інжынернай брыгады Віталь КАРЖУЕЎ быў капітанам дружыны, якая ўдзельнічала ў конкурсе «Бяспечны маршрут». Нашы ваенныя інжынеры здабылі на «Армейскіх гульнях — 2019» серабро і ў гэтай намінацыі.

— Для нас спаборніцтвы пачаліся з пераадолення інжынерна-штурмавой паласы перашкод, — расказвае Віталь Каржуеў. — Там шчыравалі камандзір аддзялення і чатыры сапёры. Пасля гэтага трэба было ўстанавіць цяжкі механізаваны мост. І вось тут нас па прылёце ў Расію чакаў сюрпрыз. Калі мы ўстанаўліваем у Беларусі такі мост пры дапамозе аўтамабіля КрАЗ, то на Армейскіх гульнях мы павінны былі паказаць тое самае на КамАЗах. Кіраванне расійскім аўтамабілем больш складанае. А на асваенне яго ў нас было ўсяго пяць дзён. Але нічога, нашы байцы справіліся там выдатна, устанавіўшы чатыры секцыі моста. І нават больш за тое, менавіта на гэтым этапе яны і выйшлі на другое месца, апярэдзіўшы каманду Узбекістана.

У трэцім раўндзе паміж сабой сапернічалі экіпажы пуцепракладчыкаў БАТ. Ім трэба было падрыхтаваць пераход цераз пражкоду. Таксама вызначаўся найлепшы экіпаж інжынернай машыны ІМР. Перад імі была пастаўлена задача разабраць лясны завал і земляную перашкоду, а таксама падрыхтаваць пераход цераз процітанкавы роў. Найлепшым тут стаў экіпаж беларусаў, які атрымаў адпаведную ўзнагароду. А цяпер самае цікавае — ён быў скамплектаваны... з вайскоўцаў тэрміновай службы. Ад іншых краін на машыне ІМР дыстанцыю праходзілі выключна кантрактнікі.

За званне найлепшай сапернічалі пяць камандаў, чатыры з якіх выйшлі ў фінал. Гэта Беларусь, Расія, Узбекістан і Кіргізія. Нашы інжынеры занялі па выніках паўфіналаў трэцяе месца, і гэтага хапіла для выхаду ў вырашальны тур.

Найлепшых вайскоўцаў на спаборніцтвы адбіраў **намеснік камандзіра 2-й інжынернай брыгады Сяргей ДЗЯМЧЫШЫН.**

— На Армейскіх гульнях мы выступаем ужо пяты раз, — паведаміў ён. — Зборная наша скамплектавана з прадстаўнікоў розных часцей. І каб падрыхтавацца да Гульняў на належным узроўні, мы на тэрыторыі брыгады стварылі амаль такую ж трасу, як і ў Цюмені.

Гутарыў
Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота перададзена
2-й інжынернай брыгадай.

Раскладваецца цяжкі механізаваны мост.

Дэлегацыя з Латвіі

На гэтым тыдні з візітам у Беларусі знаходзілася ваенная дэлегацыя з Латвіі. Міністр абароны Беларусі Андрэй Раўкоў сустрэўся з кіраўніком дэлегацыі — камандуючым Узброенымі Сіламі Латвійскай Рэспублікі генерал-лейтэнантам Леанідсам Калніньшам. Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве абароны.

На сустрэчы бакі абмяняліся думкамі па пытаннях міжнароднага парадку дня, а таксама двухбаковага ўзаемадзеяння ў галіне абароны. Акрамя гэтага, латвійская дэлегацыя наведала адну з вайсковых часцей і Ваенную акадэмію Рэспублікі Беларусь. Там яна азнаёмілася са структурай і задачамі ваеннай ВНУ, экспазіцыяй у Зале ваеннай гісторыі, наведала ІТ-роту.

З Леанідсам Калніньшам таксама сустрэўся начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Рэспублікі Беларусь генерал-маёр Алег Белаконеў. Бакі абмеркавалі пытанні міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі, а таксама перспектывы двухбаковага ваеннага супрацоўніцтва.

Серабро парашутыстаў

Надоечы завяршыўся 10-ы Кубак свету і 8-ы чэмпіянат Еўропы па парашутным спорце. Праходзіў ён у Румыніі і сабраў больш за 350 спартсменаў, якія прадстаўлялі 40 краін.

У ім прымала ўдзел і наша няштатная спартыўна-парашутная каманда ВПС і войскаў ППА Узброеных Сіл «Беларускія ястрабы». У практыкаванні «Чацвёрка-ратацыя» яны занялі другое месца, саступіўшы толькі расіянам і разам з тым істотна апярэдзіўшы каманду ЗША.

За 30 секундаў каманда з чатырох чалавек павінна пакінуць самалёт і заняць патрэбную пазіцыю ў паветры. Пасля пачынаецца выкананне практыкавання на час. Парашутысты выстройваюцца «лесвічкай» адзін над адным, і на працягу 90 секундаў верхні парашутыст перабіраецца ўніз. Тым самым атрымліваецца ратацыя.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Спецыяльны рэпартаж

Я Ў СТРОПАЛЬШЧЫКІ ПАЙШОЎ БЫ... У АРМІІ НАВУЧАЦЬ!

У 72-м аб'яднаным вучэбным цэнтры юнакі атрымліваюць спецыяльнасці, якія спатрэбяцца і ў цывільным жыцці

72-і аб'яднаны вучэбны цэнтр, што ў Печах, — самая вялікая воінская часць у Беларусі. Вучэбна-матэрыяльная база па фізічнай падрыхтоўцы і спорце дазваляе адначасова праводзіць заняткі з 1,5 тысячы курсантаў.

Як паведаміў **старшы памочнік начальніка аддзялення ідэалагічнай работы Дзмітрый НАВУМЕНКА,** у цэнтры дзейнічаюць школа па падрыхтоўцы прапаршчыкаў і спецыялістаў харчовай службы, пяць школ па падрыхтоўцы спецыялістаў родаў войскаў і спецыяльных войскаў, тры падраздзяленні забеспячэння.

«Цэнтр рыхтуе спецыялістаў для Узброеных Сіл усіх відаў і родаў войск — прапаршчыкаў, малодшых камандзіраў і спецыялістаў, ідэалагічны актыў, а таксама ваеннаабучаны рэзерв для воінскіх часцей», — тлумачыць Дзмітрый Навуменка. Так, кухары атрымліваюць 3-і ці 4-ы разрады, а без катэгорыі Е няма чаго і марыць аб «дальнабоі». Заўважце, хлопцы атрымліваюць правы бясплатна.

У 72-м АВЦ навабранцы спачатку атрымліваюць пачатковую і агульную ваенную падрыхтоўку, неабходныя тэарэтычныя веды, займаюцца ў камп'ютарных класах, на трэнажорах, агнявых гарадках, потым прыступаюць да заняткаў на тэхніцы. А праз паўгода, ужо стаўшы сапраўднымі спецыялістамі, накіроўваюцца ў часці па ўсёй Беларусі, куды былі прызваныя.

Выкладчык Валерый МЯРГУР'ЕЎ правярае веданне курсантам макета аэрадрома.

ПЕЧЫ — ЗНАК ЯКАСЦІ

Атрымаўшы павестку, **Уладзіслаў ЗЯНЬКОЎ** з Калінкавіч не сумняваўся, што служыць трэба. Не палохаўся ні неабходнасці прытрымлівацца дысцыпліны, ні фізічнай нагрузкі. Адзінае пытанне, якое мучыла на грамадзянцы, — ці ёсць дзедаўшчына ў арміі.

«Прыйшоў сюды, даведаўся, што ўжо даўно яе няма. Напрыклад, тут дакладна няма такога паняцця», — запэўнівае хлопец.

Раней Уладзіслаў здолеў атрымаць вадзіцельскае пасведчанне катэгорыі В і С ад ваенкамата, таму яму прапанавалі працягнуць вучобу — на кіроўцу-кранаўшчыка аўтамабільных пнеўмаколавых кранаў. Кажа, класна ў тым плане, што заўсёды работу знойдзеш — і даходную. Таму для юнака на грамадзянцы шмат перспектыў, хоць і ў службе ў арміі ён бачыць свае плюсы: зарплату, кар'ерны рост.

«У нас тут выдатныя і казарменныя, бытавыя ўмовы — нядаўна рамонт быў. Кормяць няблага. Фізкультурныя нарматывы выконваць няцяжка, бо акцэнт зроблены на навучанне, больш увагі аддаецца інтэлектуальнаму развіццю», — расказвае баец.

Яго таварыш **Ілья ВАНЮХІН** ужо запланаваў, што ў далейшым будзе працаваць кранаўшчыком. Малады чалавек ужо двойчы ў жыцці мяняў прафесію: першы раз вучыўся на аўтамеханіка, потым на вымяральшчыка. Але ўсё прыйшлося не па душы. А вось кранаўшчыком быць спадабалася.

«Нават з бацькамі абмеркаваў жаданне ўладкавацца на гэтую работу. Ёсць ужо і варыянты: напрыклад, сябар у роднай Рэчыцы працуе ў кампаніі, якая ездзіць на паўночныя вахты. Там можна добра зарабіць, пакуль малады, на далейшую будучыню», — разважае радавы. Усё павінна здзейсніцца, бо наймальнікі добра ведаюць: «выпускнікі» Печаў — гэта своеасаблівы знак якасці.

Сваю дзяўчыну Ілья ўжо папярэдзіў, што, магчыма, давядзецца цяжка: спачатку чакаць з арміі, потым з Поўначы. Каханая ўсё зразумела, бо Ілья стараецца для будучай сям'і.

Ну а пакуль да дэмабілізацыі ёсць час, юнак вывучае воінскія абавязкі і грамадзянскую спецыяльнасць. Адносіны з хлопцамі добрыя («Натуральна, добрыя», — удакладняе Ілья), тым больш што ў роце шмат хто з Гомельскай вобласці. З'явілася ў радавога і мара.

«Ужо хачу хутчэй паспрабаваць на кране працаваць, гэта ў пачатку ліставання будзе», — чакае Ілья. Часць, у якой ён атрымлівае прафесію, мае чатыры сучасныя краны, а працаваць на іх навучаць у любых умовах, нават у зоне, нябачнай машыністу, у катлаванне.

«Што сустракаецца ў жыцці, таму і вучаць», — тлумачыць курсант.

КАБ ЖЫЛІ САМАЛЁТЫ

На беларускіх аэрадромах шмат выпускнікоў **Валерыя МЯРГУР'ЕВА** і **Вячаслава ВОЙНАВА.** У Печах увогуле выкладаюць шмат афіцэраў запасу ці ў адстаўцы — хто, як не яны, ведаюць не толькі тэорыю, але і практыку? У школе для навучання ёсць абсталяваныя класы і рабочыя ўзоры тэхнікі ў парках — усё, што выкарыстоўваецца ў жыцці.

«Людзі прыходзяць зусім розныя: з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, з вышэйшай. Такіх, канешне, малавата, хацелася б больш», — адзначае Валерый Мяргур'еў.

Раман СКВАРЦОЎ з Рэчыцы пасля школы атрымаў спецыяльнасць тэхніка-тэхнолага ў галіне машынабудавання, а прызваўся ў Мачулішчы, у вайсковую часць ВПС і войскаў ППА. Атрымліваць спецыяльнасці кіроўцы-аператара аўтамабіляў аэрадромнага забеспячэння накіравалі ў 72-і АВЦ. Аказалася нават не вельмі складана, прызнаецца хлопец.

Яго таварышы згаджаюцца: тлумачаць усё настолькі даступна, што разабрацца ў нязвыклай тэхніцы проста.

Раман з планамі на будучыню пакуль не вызначыўся, але, кажа, можна паспрабаваць і на цывільны аэрадром працаўладкавацца. А не, дык «хоць у чымсьці дадаткова будзеш разбірацца».

ХАЙ БУДЗЕ СВЯТЛО

Стас КАВАЛЁЎ і **Уладзімір БУРАКОЎ** пасябравалі, прызваўшыся на 361-ю базу аховы і абслугоўвання. А там ёсць патрэба ў начальніках электрастанцый сілавых і асвятляльных агрэгатаў, і хлопцаў накіравалі ў Печы. Абодва мелі цывільную спецыяльнасць памочніка машыніста цеплавоза, дызельцягніка, так што і ў вучэбцы хутка скемілі, што да чаго.

Уладзімір БУРАКОЎ і Стас КАВАЛЁЎ. На службу — з усмешкай.

«Не, зусім не складана. Насамрэч, нават болей цікава становіцца, калі ўжо нешта ведаеш і можаш камусьці падказаць, паказаць. Выкладчыкі добрыя, а яшчэ да кожнага з курсантаў — індывідуальны падыход», — з задавальненнем знаёмяць з салдацкім жыццём сябры.

Пасля дэмбелю, упэўнены хлопцы, атрыманыя веды і навыкі вельмі дапамогуць. Прынамсі, Стасу, які мае намер вярнуцца на сваю работу ў лакаматыў.

Раман СКВАРЦОЎ разгортвае ўстаноўку праверкі гідрасістэм.

«Ды і думкі такой не было, каб не ісці ў армію. Хацелася самому, яшчэ з дзяцінства. Ну і калі прыйшоў, не расчараваўся. Гэта нейкі ўрок на жыццё. Зразумеў, што навучыўся цаніць кожную хвіліну. Заслужыў звальненне, дык узгадаў, як да арміі, бывае, ляжыш на той канапе... А зараз думаеш: гэта столькі ўсяго можна паспець зрабіць», — расказвае Стас.

«І адказнасць з'яўляецца, што немалаважна», — дадае Уладзімір. А яшчэ, адзначаюць сябры, за тры месяцы — тэрмін, здаецца, нядоўгі — навучыліся ўзаемадзеянню ў калектыве: дзе, як да каго падысці, у якой сітуацыі як паступіць.

Што да бытавых умоў, дык, кажуць, калектыў у 72-м АВЦ добры, камандзіры па-бацькоўску ставяцца, у казарме ўсё акуратнае, харчаванне прыемнае. «Салацікі смачненькія», — асабліва падкрэсліваюць хлопцы.

КАЖАМ «СЛУЖБА» — РАЗУМЕЕМ «КАМФОРТ»

Каб маладыя арганізмы лягчэй адаптаваліся да тэрміновай службы, у Печах увялі адмысловы рэжым дня: адбой і пад'ём не ў 22 і 6 гадзін, як усюды ў арміі, а на гадзіну пазней. Таму юнакам, якія прывыклі да начных тусовак, можна хутчэй звыкнуцца з рэжымам.

Выпускнікі 320-й школы падрыхтоўкі спецыялістаў інжынерных войскаў і войскаў радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны, Ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны карыстаюцца попытам на грамадзянскім полі дзейнасці, бо маюць практычны досвед страпоўкі, перамяшчэння, забеспячэння жыццядзейнасці ў розных умовах.

«У нас штучны тавар», — ганарыцца байцамі **намеснік камандзіра часці Аляксандр ПАРЦЯНКА.** Ён знаёміць з сістэмай відэаназірання, які дзейнічае ва ўсіх памяшканнях, акрамя прыбіральні. Тут усё — пад кантролем. Ведаюць пра гэта і самі хлопцы, і іх бацькі.

«Калі ў маці ён адзіны, то ў нас — сотня. За кожным прыглядаем», — кажа Аляксандр Парцянка. Камандзіры рот, узводаў рэгулярна тэлефануюць бацькам, паведамляюць аб поспехах сыноў, цікавяцца становішчам у сям'і, кантралююць перамяшчэнні салдат падчас звальнення.

Варвара МАРОЗАВА.
Фота аўтара.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. 8 (0212) 24-63-14, 8 (029) 510-07-63.
Продавец: открытое акционерное общество «Завод «ЭВИСТОР» 210101, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81, тел. 8 (0212) 55-11-81, 8 (044) 5941732

Повторный аукцион 12.09.2019 в 15.00.
Лот № 1. Изолированное помещение с инв. № 200/D-122150 площадью – 403,7 кв. м, назначение – производственное помещение, наименование – производственное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/20-4. Нач. цена: 8 386,81 бел. руб. (без учета НДС). Задаток: 838,68 бел. руб.
Лот № 2. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163118 площадью – 303,5 кв. м. Наименование: бытовые помещения. Назначение: помещение неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-11а. Нач. цена: 12 918,00 бел. руб. (без учета НДС). Задаток: 1 291,80 бел. руб.
Лот № 3. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163116 площадью 584,6 кв. м. Наименование: административное помещение. Назначение: административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-11б. Нач. цена: 26 971,72 бел. руб. (без учета НДС). Задаток: 2 697,17 бел. руб.
Лот № 4. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163119 площадью 555,1 кв. м. Наименование: бытовые помещения. Назначение: помещение неустановленного назначения по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-11. Нач. цена: 20 699,17 бел. руб. (без учета НДС). Задаток: 2 069,91 бел. руб.
Лот № 5. Изолированное помещение с инв. № 200/D-123350 площадью 161,8 кв. м. Наименование: административное помещение. Назначение: административное помещение по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе,81/19-14. Нач. цена: 5 293,84 бел. руб. (без учета НДС). Задаток: 529,38 бел. руб.
Лот № 6. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163107 площадью 330,4 кв. м. Наименование: административное помещение. Назначение: административное помещение по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16. Нач. цена: 13 510,24 бел. руб. (без учета НДС). Задаток: 1 351,02 бел. руб.
Лот № 7. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163111 площадью 265,5 кв. м. Наименование: административное помещение. Назначение: административное помещение по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16в. Нач. цена: 10 862,07 бел. руб. (без учета НДС). Задаток: 1 086,20 бел. руб.
Лот № 8. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163108 площадью 37,7 кв. м. Наименование: административное помещение. Назначение: административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16а. Нач. цена: 1 535,98 бел. руб. (без учета НДС). Задаток: 153,59 бел. руб.
Лот № 9. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163109 площадью 142,3 кв. м. Наименование: административное помещение. Назначение: административное помещение по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16б. Нач. цена: 5 818,09 бел. руб. (без учета НДС). Задаток: 581,80 бел. руб.
Лот № 10. Изолированное помещение с инв. № 200/D-184038 площадью 556,7 кв. м. Наименование: производственное помещение. Назначение: производственное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/20-19. Нач. цена: 16 807,23 бел. руб. (без учета НДС). Задаток: 1 680,72 бел. руб.

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 12.09.2019 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 26.08.2019 с 08:30 по 11.09.2019 до 17:30. Изолированные помещения расположены на земельном участке с кадастровым № 240100000001002628 (общая долевая аренда). Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 09.04.2019, 15.06.2019

Первый аукцион 26.09.2019 в 15.00

Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 200/С-86464, объем – 288 куб. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, резервуар вблизи здания № 81/30, наименование – резервуар, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения. Нач. цена: 32 604,31 бел. руб. (без учета НДС). Задаток: 3 260,43 бел. руб.

Лот № 2. Изолированное помещение с инв. № 200/D-172940 площадью 595,5 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/20-5а, наименование – производственное помещение, назначение – производственное помещение. Нач. цена: 47 033,85 бел. руб. (без учета НДС). Задаток: 4 703,38 бел. руб.

Лот № 3. Изолированное помещение с инв. № 200/D-184032, площадью 134,4 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/20-13, наименование – гараж, назначение – помещение транспортного назначения. Обременение: наличие договора аренды № 13 от 01.09.2018 сроком по 31.08.2023 включительно. Нач. цена: 28 142,65 бел. руб. (без учета НДС). Задаток: 2 814,26 бел. руб.

Дата, время и место проведения аукциона: 26.09.2019 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 26.08.2019 с 08.30 по 25.09.2019 до 17.30. Изолированные помещения и капитальное строение расположены на земельном участке с кадастровым № 240100000001002628 (общая долевая аренда)

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Условия аукциона: Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по подготовке документации на р/с, указанный в протоколе аукциона, подписать договор купли-продажи в течение 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплатить за объект в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС сверх цены продажи объекта. **Аукцион проводится** в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ — копия документа, подтверждающего гос. егистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем — легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ — нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя — доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. **Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300065782 ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (44) 5941732.

ККУП «Витебский областной центр маркетинга» сообщает, что в извещении, опубликованном в газете «Звязда» от 03.08.2019 г., о продаже земельных участков в Витебском районе слова: «и повторных», «повторного» исключить. Тел. (0212) 24-63-14 УНП 390477566.

ККУП «Витебский областной центр маркетинга» сообщает об аннулировании публикации извещения в газете «Звязда» от 23.08.2019 о проведении аукциона по продаже имущества унитарного предприятия «Витебская универсальная база». Тел. (0212) 24-63-14
УНП 390477566.

Свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя Пацукевича Виталия Станиславовича УНП 101321531 считать недействительным в связи с утерей

ДЕЩЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ УЗДЕНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

26 сентября 2019 года по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет председателя (2-й этаж, кабинет № 1) в 10.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена, руб.	Расходы по подготовке, руб.	Примечание
Лот № 1	Дещенский сельисполком	д. Володьки, ул. Окружная, уч. 37	0,1057	625680202201000298	8000,00	1139,23+ расходы на публикацию	имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению, проектирование объектов транспортной инфраструктуры подлежит возмещению в размере 725 руб. 59 коп.
Лот № 2	Дещенский сельисполком	д. Городище, ул. Центральная, уч. 10А	0,1500	625680203401000040	9000,00	1364,61+ расходы на публикацию	*имеется возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению*
Лот № 3	Дещенский сельисполком	д. Дегтяное, ул. Центральная, уч. 31А	0,1973	625682503101000066	12 000,00	0 + расходы на публикацию	имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению
Лот № 4	Дещенский сельисполком	д. Ладыга, ул. Ладыжская, уч. 5Б	0,1499	625680207101000031	4 500,00	0 + расходы на публикацию	*имеется возможность подключения к электроснабжению*
Лот № 5	Дещенский сельисполком	д. Рябиновка, ул. Рябиновая, уч. 43	0,1500	625680211801000079	8000,00	1179,28 + расходы на публикацию	имеется возможность подключения к водоснабжению, электроснабжению, газоснабжению

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.

Задаток в размере **10 процентов от начальной цены** земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № BY47AKBB36410625001146000000 Дещенского сельского исполнительного комитета в ЦБУ № 625 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Узда, МФО AKBBBY2X, УНП 601068832. Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет управляющего делами (2-й этаж), с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по **20 сентября 2019 года** включительно.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

заверенный банком документ об оплате задатка;

копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Заключительная регистрация – с 9.30 до 9.45 в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем предмета аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем самостоятельного выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: info@uzda.gov.by либо по телефонам 8 (01718) 3 51 35, 3 51 49

ВНИМАНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Завод сборного железобетона № 1»

(г. Минск, ул. Передовая, 6)

Совет директоров ОАО «Завод сборного железобетона №1» доводит до сведения акционеров, что 30.08.2019 г. состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Завод сборного железобетона № 1».

Место проведения собрания – г. Минск, ул. Передовая, 6 (кабинет генерального директора);

Время начала собрания – 11.00.

Время и место регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 10.30 до 10.45 по адресу: г. Минск, ул. Передовая, 6 (кабинет генерального директора).

Время и место ознакомления акционеров с документами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 26.08.2019 г. по 29.08.2019 г., по месту нахождения ОАО «Завод сборного железобетона № 1»: г. Минск, ул. Передовая, 6 (кабинет генерального директора) с 9.00 до 16.00; 30.08.2019 г. – по месту проведения собрания.

Орган общества, созывающий внеочередное общее собрание акционеров, – совет директоров, основание его созыва – собственная инициатива совета директоров.

Повестка дня

О реорганизации ОАО «Завод сборного железобетона № 1».

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 29.08.2019 г.

Просим принять участие в собрании или поручить представлять Ваши интересы на собрании акционеров представителю. Для участия в собрании акционеру необходимо при себе иметь паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность, оформленную в соответствии с требованиями законодательства.

Дополнительная информация по телефону + 375 17 398 95 31.

УНП 100028892

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703
Продавец	ООО «Завод автомобильных прицепов и кузовов «МАЗ-Купава», г. Минск, ул. Машиностроителей, д. 18

Предмет аукциона (имущество реализуется одним лотом).
Месторасположение: Минская обл., Червенский р-н, Смиловичский с/с, д. Старино

Производственная база: цех деревообработки с административными помещениями (615/С-35497, 1027,1 кв. м), в т. ч. вент. камеры, 2 шт., рампа, 2 шт., сети питьев. водопровода 184,7 м; сети быт. (255,7 м) и ливн. (287,4 м) канализации, очистные сооружения, двухкамер. септик, поля фильтрации 235 м, покрытия 6446 кв. м; **склад** (615/С-35853, 150,6 кв. м); **КПП** (615/С-35856, 7,6 кв. м), в т. ч. ограждение 639,7 м.; **ТП** (615/С-245, 68,3 кв. м); **водозаборная скважина** 615/С-35855), в т. ч. насос Grundfos; **насосная станция** (615/С-35496, 25,2 кв. м), в т. ч. 2 резервуара 150 куб. м, сети пожар. водопровода 484,3 м; **иное имущество:** сети электроснабжения и оборудование (в соответствии с перечнем, размещенным на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

Сведения о земельном участке: пл. **2,5727 га** предоставлен на праве аренды по 20.11.2115 для обслуживания цеха деревообработки с административно-быт. помещениями, зданий и сооружений. Ограничения - находится в охран. зонах электрич. сетей свыше 1000 В, пл. 0,2 га

Начальная цена с НДС – 390 386 руб. 7 коп. (снижена на 50 %)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: 60 % от цены продажи имущества, с учетом ранее внесенной суммы задатка оплачиваются в течение 10 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, оставшаяся сумма оплачивается с рассрочкой платежа на срок до 6 месяцев

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 17.07.2019**

Аукцион состоится 26.09.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 25.09.2019 до 17.00** по указанному адресу. Тел: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. **www.cpo.by**

В связи с утерей свидетельства о государственной регистрации (выдано Мингорисполкомом 17.03.2015 г.), документов финансово-хозяйственной деятельности, а также печатей и штампов Индивидуального предпринимателя Бричковского Виталия Игоревича (УНП 192443661), прошу считать утерянными и недействительными печати, штампы и свидетельство о государственной регистрации Индивидуального предпринимателя Бричковского Виталия Игоревича

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Рапс» (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже:

лот № 1. Здание автогаража с бетонной площадкой и ограждением (в состав входят: здание автогаража с бетонной площадкой и ограждением, пристройка, площадка, ограждение) **с инвентарным номером № 600/С-121223 общей площадью 774,3 кв. м,** расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623683900001000140 площадью 0,6032 га по адресу: Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, 7, район д. Аннополь, и **здание пропускного пункта с инвентарным номером № 600/С-121220 общей площадью 21,7 кв. м,** расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623683900001000143 площадью 0,0249 га по адресу: Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, район д. Аннополь.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 233 109,72 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **23 310,00 бел. руб.**).

Лот № 2. Здание навеса для сельскохозяйственных машин (в состав входят: здание навеса для сельскохозяйственных машин и пристройка) **с инвентарным номером № 600/С-121224 общей площадью 548,3 кв. м,** расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623683900001000141 площадью 0,1543 га по адресу: Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, район д. Аннополь.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 52 844,88 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **5 284,00 бел. руб.**) **(далее — Объекты).**

Условия продажи:

- улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;

- поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

- обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта — с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости;

- разработка проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством;

- проведение реконструкции (строительства) недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета;

- использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством;

- запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330 000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата объекта производится в рассрочку на 1 год равными долями не позднее последнего рабочего дня, начиная с месяца, в котором будет осуществлена государственная регистрация договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 4 (четыре) процента от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 18.10.2018, 18.12.2018. Аукцион состоится **18.09.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.09.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

ПА ПРЫНЦЫПЕ САМАДАСТАТКОВАСЦІ

Самы аддалены — не значыць абдзелены

— Наш раён — адзін з самых аддаленых ад абласнога цэнтра ў Беларусі. Ад Пастаў да Віцебска — 260 кіламетраў, — кажа **галоўны ўрач Пастаўскай цэнтральнай раённай бальніцы Уладзімір ЧАКАВЫ,** які, дарэчы, узначальвае яе ўжо амаль чвэрць стагоддзя. — Таму мы адпрацоўваем мадэль аказання дапамогі ў аддаленым раёне, якая грунтуецца на прынцыпах самадастатковасці. Гэта значыць, максімальна магчымы спектр медыцынскіх паслуг людзі павінны атрымаць у сваім раёне. Мадэль была распрацавана Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэтам сумесна з выканаўчай уладай нашага раёна. Акрамя цэнтральнай раённай бальніцы, у раёне ёсць Ваенны шпіталь пагранічнай службы, дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Ветразь». Максімальна выкарыстоўваем тое абсталяванне, якое ёсць у гэтых установах. Калі пацыенту патрабуецца складаная лячэнне, накіроўваем найперш у Віцебск. У асобных выпадках выкарыстоўваем і Мінск — ад нас ён за 160 кіламетраў. Вось днямі адправілі пацыента з інфарктам у 9-ю сталічную бальніцу.

У выпадку сардэчна-сасудзістых катастроф, калі важна аказаць дапамогу ў першыя гадзіны, па словах галоўнага ўрача, пацыента накіроўваюць у клінікі з ангіяграфічнымі комплексамі. Найчасцей — у Наваполацк, а таксама ў абласны цэнтр і сталіцу.

— Нягледзячы на аддаленасць раёна, падчас транспарціроўкі хворых у нас не было дапушчана выпадкаў летальнасці ці ўзнікнення ўскладненняў, — падкрэслівае Уладзімір Чакавы.

Ёсць у бальніцы і радзільнае аддзяленне. Усе роды без рызыкі ўзнікнення ўскладненняў, а гэта 60 %, прымаюць тут. Летась у Пастаўскай ЦРБ нарадзілася больш за 200 малых. На чарзе — мадэрнізацыя радзільнага і дзіцячага аддзяленняў, а пакуль завершаны рамонт у аддзяленні жаночай кансультацыі. Кабінеты аснашчаны новым абсталяваннем і мэбляй. Прыйшоўшы на прыём да гінеколага, пры паказаннях можна адразу прайсці УГД.

Гэта, бадай, адзіны прыклад у Беларусі, калі гісторыка-культурны помнік, які мае такі высокі рэйтынг значнасці, знаходзіцца на балансе бальніцы і эксплуатуецца як медыцынскі корпус.

— Усе акушэры-гінеколагі прайшлі падрыхтоўку па УГД-дыягностыцы. Сёння іх у нас чацвёра. Мы актыўна працуем над тым, каб урачы мелі дзве спецыялізацыі: маглі праводзіць УГД ці ФГДС-дыягностыку, эндаскапічныя даследаванні. На сённяшні дзень восем нашых урачоў прайшлі падрыхтоўку па УГД-дыягностыцы. Усе тыя абследаванні, якія па стандарце патрабуюцца на першым узроўні аказання дапамогі, — выконваем. Дзесяць гадоў таму мы нядрэнна абнавілі абсталяванне, праўда, некаторае ўжо зноў патрабуе мадэрнізацыі, — дзеліцца галоўны ўрач. — У нас два апараты для каланаскапіі, бранхаскоп, эндаскапічнае абсталяванне, тры апараты УГД, праўда, два з іх эксплуатуюцца больш за 10 гадоў. І мы маем вострую патрэбу ў яшчэ адным УГД-апараце высокага класа. З'явілася ў нас і магчымасць рабіць гемадыяліз, дзякуючы чаму мы падрыхтавалі 12 пацыентаў, у тым ліку адно дзіця, да перасадкі нырак, якую ім выканалі ў сталіцы. Гемадыяліз дапамагае нам выратоўваць людзей і пры атручваннях. Што датычыцца такіх абследаванняў, як КТ і МРТ, то каля 300 пацыентаў штогод накіроўваем у Полацк, Наваполацк або Віцебск. Многія абследуюцца па сваёй ініцыятыве ў Мінску і Мінскай вобласці.

Зусім нядаўна ў паліклініцы адкрыўся пасля рамонту рэнтгенаўскі кабінет. Тут сучаснае лічбавае абсталяванне. Узводзіцца і новы будынак для патолага-анатамічнага бюро, які плануюць здаць у кастрычніку-лістападзе.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Палаты — у Палацы

Будаўніцтва яшчэ аднаго корпуса для стацыянара таксама ў планах. Рэч у тым, што на тэрыторыі медыцынскага гарадка ў Паставах знаходзіцца гісторыка-культурны помнік другой паловы XVIII — першай паловы XIX стагоддзя — Палац Тызенгаўза. У XX стагоддзі тут размяшчаліся розныя ўстановы — шпіталі падчас Першай і Другой сусветных войнаў, гімназія, НКВД і міліцыя ў мірны час. У сярэдзіне мінулага стагоддзя палац быў перададзены бальніцы. Калі былі пабудаваны новыя карпусы паліклінікі і стацыянара, у палацы ўсё роўна засталіся некаторыя падраздзяленні.

— У корпусе не было інжынерных сетак і камунікацый, і мы іх пабудавалі: падвялі ў палаты каналізацыю, ваду, уладкавалі санітарныя вузлы. Тут размяшчаюцца неўралагічнае аддзяленне стацыянара, аддзяленне пералівання крыві, фізіятэрапеўтычнае аддзяленне. Але далей будаваць штосьці ў корпусе, якому 250 гадоў, немэтазгодна, — упэўнены галоўны ўрач. — Лепш пабудаваць новы невялікі корпус на 30 ложкаў, каб вывесці з палаца нашы медыцынскія падраздзяленні.

Дарэчы, на падтрыманне палаца ўжо ў гэтым стагоддзі было выдзелена два гранты ЮНЭСКА (Палац Тызенгаўза стаў першым у Віцебскай вобласці помнікам, адзначаным такім чынам). Першы дазволіў стварыць умовы, каб захаваць яго ад разбурэння. На сродкі другога ў падвальных памяшканнях быў створаны музей, які сёння наведваюць госці горада, у тым ліку і замежныя турысты.

— У нас шмат арганізаваных груп, асабліва ў выхадныя. Гэта нядзіўна, бо ў розных рэйтынгах палац уваходзіць у дзясятку лепшых аб'ектаў Віцебскай вобласці. З намі вядуць перапіску людзі з Еўропы, у прыватнасці з Вялікабрытаніі, якія ў розныя часы тут пабывалі і продкі якіх былі звязаны з гэтымі мясцінамі, — расказвае галоўны ўрач. — У межах нашых фестываляў тут праводзяцца канцэрты пад адкрытым небам, гістарычныя рэканструкцыі, з'езды біёлагаў і арнітолагаў. Эксплуатацыя будынка цалкам ускладзена на раённую бальніцу, і мы з гэтай нехарактэрнай для медыцынскай установы функцыяй спраўляемся. Гэта, бадай, адзіны прыклад у Беларусі, калі гісторыка-культурны помнік, які мае такі высокі рэйтынг значнасці, знаходзіцца на балансе бальніцы і эксплуатуецца як медыцынскі корпус. Але надышоў час размежаваць патокі турыстаў і медработнікаў з пацыентамі. Цяпер ідзе карэкціроўка праекта.

Вялікая колькасць турыстаў, дарэчы, вымагае ад калектыву бальніцы падтрымліваць на ўзроўні тэрыторыю медыцынскага гарадка. Тут устаноўлены помнік Канстанціну Тызенгаўзу і сёлета з'явіцца яшчэ адзін — Антонію Тызенгаўзу. Праведзена ландшафтнае добраўпарадкаванне: на тэрыторыі высаджана некалькі тысяч кветак, працуюць фантаны і каскады, устаноўлены кампазіцыі са скульптур багоў медыцыны і здароўя. Побач з музеем размешчана кафэ.

Каб маладыя спецыялісты падоўжылі кантракт...

У Пастаўскай цэнтральнай раённай бальніцы сёння працуюць 102 урачы. Пры гэтым 42 медработнікі знаходзяцца ў дэкрэтных адпачынках.

— У нас закрыты амаль усе стаўкі, але з улікам пераважна жаночага калектыву неабходнасць у кадрах усё роўна захоўваецца. З дзевяці педыятраў, напрыклад, чацвёра зараз у дэкрэце. Пры гэтым наш калектыў, бадай, самы мужчынскі сярод усіх медыцынскіх устаноў Віцебшчыны — у нас звыш 30 % мужчын. Напрыклад, працуе восем падпалкоўнікаў медыцынскай службы, якія перайшлі з ваеннага шпіталя пагранічнай службы, — з гонарам кажа пра калектыў Уладзімір Чакавы. — У два бліжэйшыя гады мы чакаем дзевяць урачоў, якім выдавалі мэтавыя накіраванні. Яны павінны адпрацаваць у нас пяць гадоў.

Дарэчы, маладыя спецыялісты, якія прыехалі працаваць па размеркаванні, застаюцца ў Паставах.

Рэнтгеналабарант Пастаўскай ЦРБ Юрый ЛІТВІНОВІЧ з новым абсталяваннем на «ты».

— Сёлета і летась усе шэсць урачоў агульнай практыкі, адпрацаваўшы неабходны тэрмін, падоўжылі кантракты. Мы ўсім прапануем прайсці перападрыхтоўку і атрымаць другасную спецыялізацыю, а таксама павысіць сваю катэгорыю. Усё гэта дае магчымасць павялічыць ім зарплату. У нас малады доктар, які працуе ў першасным звяне, атрымлівае да тысячы рублёў і нават больш. Прапануем ім і жыллё — арэндныя кватэры. Акрамя таго, наш сацыяльны пакет прадугледжвае 50-працэнтную аплату кватэры па найме. Маладыя спецыялісты больш ахвотна выбіраюць кватэры па найме з мэбляй і бытавой тэхнікай, якія каштуюць 100—140 рублёў. Тым, у каго ёсць сям'я, зручней, канешне, жыць у двухпакаёвай арэнднай кватэры, — аргументуе галоўны ўрач.

Сакрэт раёна доўгажыхароў

Пастаўская ЦРБ абслугоўвае амаль 40 тысяч насельніцтва. У яе склад уваходзяць дзве паліклінікі (у Паставах і Варапаеве) і восем амбулаторый урача агульнай практыкі. Тры з іх — у Паставах, пяць — у сельскай мясцовасці, дзе вядзе прыём 18 урачоў. Амбулаторыі цалкам укамплектаваны неабходным абсталяваннем, у некаторых ёсць стаматалагічныя кабінеты, кабінеты фізіяпрацэдур, апараты УГД-дыягностыкі. Усе амбулаторыі аснашчаны электроннымі праграмамі: там працуюць з электроннымі медыцынскімі карткамі, урач атрымлівае на планшэт вынікі аналізаў пацыента з лабараторыі ці рэнтгенаўскія здымкі. Урачы аказваюць шматпрофільную дапамогу: робяць хірургічныя апрацоўкі, падбіраюць акуляры, абследуюць пацыентаў з лор-захворваннямі, робяць кардыяграму і г. д.

— З 2001 года Пастаўскі раён стаў базавым у віцебскім эксперыменце па адпрацоўцы рэфармавання сістэмы першаснай медыка-сацыяльнай дапамогі па прынцыпе ўрачоў агульнай практыкі. Мы сталі піянерамі ў краіне па гэтай рэарганізацыі. Першай была наша Навасёлкаўская амбулаторыя, затым Камайская ўчастковая бальніца. Ужо пяць гадоў, як мы цалкам перайшлі ад участковых тэрапеўтаў да ўрачоў агульнай практыкі, — удакладняе суразмоўнік.

Дарэчы, з 2016 года ўрачы агульнай практыкі Пастаўскай ЦРБ нязменна рабіліся лепшымі на конкурсах прафесійнага майстэрства. Загадчык паліклінікі Пастаўскай ЦРБ Марына Брэсцкая перамагла ў намінацыі «Найлепшы ўрач агульнай практыкі» ў 2016 годзе, Навасёлкаўская амбулаторыя (загадчык Васіль Сівіцкі) стала найлепшай у краіне ў 2017 годзе, а летась сярод урачоў агульнай практыкі вызначыўся загадчык аддзялення Пастаўскай ЦРБ Міхаіл Петух.

— Мы пайшлі на дэцэнтралізацыю і адкрылі ў Паставах тры амбулаторыі ўрача агульнай практыкі. Гэта дазволіла разгрузіць паліклініку, тут абслугоўваецца толькі тое насельніцтва, якое жыве ў гэтым мікраёне, і кансультуюць вузкія спецыялісты, — тлумачыць галоўны ўрач.

Дарэчы, увядзенне ўрачоў агульнай практыкі дазволіла разгрузіць і вузкіх спецыялістаў.

— Сёння ў нас 19-е, і самы далёкі запіс — да афтальмолага на 23-е чысло. Да хірурга вы трапіце ў дзень звароту, гэтак жа як да дэрматолага і гінеколага, — канстатуе, зверыўшыся з камп'ютарам, Уладзімір Чакавы. — І зразумела, да ўрача агульнай практыкі — у дзень звароту ён павінен прыняць любога пацыента. У нас штодзённа праводзіцца маніторынг рэжымаў чакання, і калі цягам дзесяці дзён пацыенты не могуць трапіць да спецыяліста, праграма на камп'ютары інфармуе мяне і загадчыка паліклінікі, мы збіраемся і аналізуем, як перараз мяркаваць рэсурсы.

Талончык да ўрача вузкай спецыялізацыі заказвае ўрач агульнай практыкі, калі ў пацыента ёсць паказанні да кансультацыі. Або да такога спецыяліста трапляюць з вострай паталогіяй па хуткай дапамозе. Таксама ўрач самастойна выклікае хворых, якія знаходзяцца ў яго на дыспансерным уліку (як правіла, у кожнага спецыяліста такіх пацыентаў 300—400).

У Пастаўскім раёне 450 вёсак. У іх працуе 26 ФАПаў. Раз-два на тыдзень урачы агульнай практыкі выязджаюць на ФАПы. Спецыялісты вузкай спецыялізацыі наведваюць сельскія медыцынскія ўстановы па аўторках. Ёсць і перасоўны медыцынскі пункт, які выязджае ў вёскі, — у ім адразу ж можна набыць і неабходныя лекі. У любую вёску, адкуль паступае зварот двух і больш грамадзян, таксама выязджае ўрач.

— Пры кожнай участковай бальніцы ў нас ёсць ложкі сястрынскага догляду. Прычым кожны год восенню мы мяняем іх профіль: 30 % ложкаў пакідаем для лячэння вострай і хранічнай паталогіі, а вось астатнія пераводзім у медыка-сацыяльныя. І з лістапада да красавіка сталыя людзі з маленькіх вёсак маюць магчымасць абследавацца, здаць аналізы, падлячыцца, а да лета вяртаюцца ў свой дом. Праз такія медыка-сацыяльныя ложкі, пансіянаты, якія належаць упраўленню па працы і сацыяльнай абароне, мы адаптавалі нашу сельскую медыцыну пад патрэбы вяскоўцаў. І атрымліваецца, што нашы людзі жывуць даўжэй, чым у суседніх раёнах, — рэзюмуе суразмоўнік. — З Глыбоцкім раёнам мы лідары па доўгажыхарах у рэгіёне. У нас больш за дзве тысячы чалавек перасягнула 80-гадовы рубеж.

Дарэчы, ужо тры дзесяцігоддзі людзі даверяюць Уладзіміру Мікалаевічу прадстаўляць іх інтарэсы ў мясцовых Саветах дэпутатаў, 20 гадоў з іх — у Віцебскім абласным Савеце дэпутатаў.

— Увесь гэты час мяне вылучае адзін і той жа калектыў і выбіраюць жыхары адной і той жа акругі. Значыць, мая пазіцыя адпавядае чаканням людзей, — тлумачыць такое пастаянства суразмоўнік.

Алена КРАВЕЦ, *г. Паставы.*

Уладзімір ЦЭСЛЕР:

«Тысячы людзей напішуць «Джаконду», лепшую за арыгінал»

«Сёння я вару грыбны суп, — сустракае мяне ў сваёй майстэрні самы вядомы беларускі дызайнер. — Хочаш кавуна?» Вось дзе ствараюцца адны з самых трапных мастацкіх водгукаў на нашу рэчаіснасць. Пагартайце цэслераў інстаграм і знойдзеце тут шмат таго, на што можна сказаць «Гэта Беларусь, дзетка». Ну і не толькі Беларусь, вядома ж. Са смехам, цыгарэтамі і цэлай шафай мастацкіх альбомаў побач Уладзімір расказаў пра стасункі з заказчыкамі, унутраную свабоду і што трэба сказаць, каб ён аддаў вам ключы ад сваёй кватэры.

— Наколькі дызайн з пункту гледжання нашага грамадства і афіцыйных структур уключаны ў сферу культуры?

— Дызайн ствараецца, каб уплываць на мазгі — мяняць стаўленне чалавека да рэчаў і жыцця ў цэлым, таму яму прасцей кантактаваць з прамысловасцю. Ён з'явіўся ў Штатах, калі трэба было прымусіць чалавека купіць шосты прас, а ўсе астатнія выкінуць. Вось чайная лыжка — пакупніку яна падабаецца, але не падыходзіць да іншага посуду, і тады да гэтай лыжкі з'яўляюцца кухня, аўтамабіль і цэлы архітэктурны стыль. Канешне, нешта падобнае адбываецца і ў нас, але беларускі спажывец пакуль заняты пакупкай першага праса. Так ці інакш нашы дызайнеры не звязаныя і маюць права ехаць куды заўгодна — і едуць, і працуюць, і, паверце, робяць паспяховыя рэчы. Мяне не здзіўляе, калі заказчык, напрыклад, з Германіі звяртаецца да беларускіх аўтараў, гэта стала нормай.

— Значыць, да прамысловасці дызайн мае большае дачыненне, чым да мастацтва?

— Безумоўна, гэта мастацтва, але дызайнер не толькі стварае вобраз — ён укліньваецца ў вобласць сацыялогіі, прадказвае, што будзе заўтра, і згодна з гэтым стварае нейкі прадукт. Я часта бачу, як работа, што не «ішла» дваццаць гадоў таму, раптам «ідзе».

— Што вы маеце на ўвазе пад словам «ідзе»?

— У сучасных мастакоў часта пытаюцца: «Ды што вы ўмееце? Слабо напісаць, як Леанарда да Вінчы?» Канешне, не слабо, сёння знойдуцца тысячы людзей, якія напішуць «Джаконду», можа, і лепшую за арыгінал, але зрабіць гэта трэба было менавіта ў XVI стагоддзі. Цяпер іншыя часы: мастацтва не можа быць такім ціхім, яно наадварот, нават калі гэта на шкоду майстэрству, павінна быць нахабным. Рэчы, пазбаўленыя шоку, сёння амаль не працуюць, праходзяць міма і ўсё.

— Мастацтва для развіцця мае патрэбу ў дапамозе дзяржавы, але дызайн, выглядае на тое, незалежны ад яе клопату.

— Дзяржава ў дызайне не пры чым, існуе шмат прыватных прадпрыемстваў, якія ўносяць у яго ўклад. Што дзяржаўнае, а што не, я нават не задумваюся. Мастацтва ўвогуле нікому не належыць, а мастак ні ад кога не залежыць. У свой час усе думалі, што я буду акцёрам, і я паступіў у Тэатральна-мастацкі інстытут, але на мастака. Я думаў пра свой выбар, а потым зразумеў: «Ну які акцёр? Ён усё жыццё ад нечага ці некага залежыць». Мастак усё ж такі нешта напісаў і паставіў за шафу, маўляў, «вось, я гэта зрабіў».

— А якую ролю ў дызайне адыгрывае заказчык: ці не ён насамрэч яго фарміруе?

— На жаль, так, заказчык часта навязвае дызайнеру сваё бачанне, ён можа не разумець, што той робіць, але ведаць, чаго яму хочацца, і прасіць улічыць сваё, бывае, памылковае меркаванне. Часам для таго, каб работа «прайшла», у заказчыка трэба ўкласці ўсю гісторыю мастацтва, а гэта столькі энергіі ўпустую. Таму я разумею дызайнераў, якія думаюць: «Пакуль я буду спрачацца, пройдзе процьма часу, зраблю работу і ўсё». Часам заказчыкі збіраюць па тваіх работах цэлыя фокус-групы. «Што ты робіш? — кажу. — Ты ж у мяне спытай, інакш навошта ты да мяне прыйшоў?» З музыкай, цікава, яны гэтак жа сябе паводзяць? — просяць вось тут валторны дадаць, а тут скрыпкі?

— А ў вас з вашым імем бывае такое, што заказчык не прымае работу?

— У большасці выпадкаў маё імя ні на што не ўплывае. Мне могуць казаць, як рабіць, паказваць грошы, пагражаць тым, што не заплацяць. Часта, калі прыходжу ў нейкае агенцтва дызайну, прашу паказаць мне непрынятыя заказчыкам ролікі, якімі яны ганарацца, і бачу неразуменне, маўляў, навошта такая работа. Яны настолькі рацыянальныя, што асабліва не спрачаюцца, і я іх разумею, бо рана ці позна сіл змагацца не застаецца.

— А Уладзімір Цэслер ніколі не ідзе на кампраміс.

— Няпраўда: калі стоміцся — ідзеш.

— Быць вядомым дызайнерам — ці значыць добра зарабляць?

— Я ніколі не займаўся мэтанакіраваным зараблянням грошай — зарабляеш на тое, каб аплаціць майстэрню, матэрыялы, тэхналогію. Паверце, на імёны нікто не глядзіць: «Мы хочам, каб зрабіў ты, а заплаціць, як студэнту». Гэта нармальная гісторыя, грошы ўсе ўмеюць лічыць.

— Мяне зачапіла вашае выказванне пра тое, што добры мастак і мастак, які добра прадаецца, не могуць быць адной і той жа персонай.

Фота з асабістага архіва Уладзіміра ЦЭСЛЕРА.

— Магчыма, і могуць, але я такіх у Беларусі не бачыў. Вельмі шмат выдатных мастакоў застаецца ў цені, бо імі трэба займацца і прадаваць, а рынка мастацтва тут пакуль няма.

— А вы хто — добры мастак ці той, хто добра прадаецца?

— Я сярэдні. Мне хапае, каб аплачваць майстэрню, тра-та-та, але ў мяне ніколі не атрымлівалася адкладваць, у мяне няма аўтамабіля, быў матацыкл, але я яго, калі будаваў кватэру, прадаў, хоць і не хацеў. Значыць, калі я меў патрэбу ў такіх грашах, я не «такі ўжо». Але ў Мінску ёсць паспяховыя праз прамысловыя заказы людзі. Я не кажу пра жывапіс — там свая спецыфіка, дызайн хутчэйшы.

— Як мастак вы фарміраваліся ў даволі «строгі» савецкі час. Як гэта было?

— У мяне была кампанія блізкіх па духу людзей, мы захапляліся хард-рокам, і мне здавалася, што ўвесь свет такі. Я крыху выпадаў з сістэмы, а за гэта таксама трэба плаціць: у мяне, напрыклад, не было майстэрні і часам здавалася, што наперадзе тупік і нічога не будзе. Можна было, як большасць маіх сяброў, з'ехаць, але для мяне б гэта быў страшны злом. Аказалася, усё не так безнадзейна: калі ёсць моцны стрыжань, ён вас трымае, дзе б вы ні знаходзіліся. Неяк ехаў з маладым архітэктарам, ён убачыў машыну і кажа: «Глядзі, якая тачка, у мяне такой ніколі не будзе». А яму 22 гады! Для мяне ў гэтым узросце галоўнай каштоўнасцю было знаёмства з цікавым чалавекам. Мне спадабалася, як у фільме «Жыццё ў матэрыяльным свеце» Джорджу Харысану задаюць пытанне, што для яго значаць паспяховасць, знакамітасць і забяспечанасць, а ён адказвае: «Цяпер я магу пазнаёміцца з тым, з кім хачу».

— У інстытуце былі нейкія рамкі?

— Мяне тры разы з яго выганялі — за якую-небудзь насценгазету, прычынай магло быць што заўгодна. Калі я паступаў, мастак, які за мяне перажываў, прыйшоў на экзамен і ўбачыў, як я сяджу — а ў мяне былі доўгія валасы — і побач стаіць бутэлька піва. Ён абураўся: «Што ты робіш?» — а мне проста захацелася піва, хоць я і не яго аматар, і я нічога не рабіў спецыяльна, бо нават не думаў, што ў гэтым можна нешта такое ўгледзець. Я адрозніваўся даволі свабоднымі паводзінамі, але ж не антысавецкімі справамі, мы толькі анекдоты расказвалі, хоць, можа, занадта гучна і не тым. Вялікая частка мастакоў, я заўважыў, мае патрэбу быць ля моцнай рукі. Вось партыя, там усё надзейна, а калі ўсё рассыпалася, пайшлі ў царкву, то-бок усё роўна за нешта зачапіліся.

— Шмат старэйшых аўтараў, у тым ліку і вы, у сваім мастацтве «маладзейшыя» за маладых — у чым справа?

— Я выхоўваўся на добрай музыцы. Неяк мы сталі абмяркоўваць яе са знаёмымі з Заходняй Германіі, і ў іх раты адкрыліся ад таго, што мы слухалі і ведалі. Мы былі ў курсе ўсяго: інфармацыю не схаваеш, і мы яе вывуджвалі, але такіх людзей, можа, сапраўды было няшмат. Я знаёміўся з чалавекам і ў першую чаргу пытаўся, што ён слухае, а потым выражаў, размаўляць з ім ці не. Калі скажуць «Джэтра Тал», можна і ключы ад кватэры аддаць, таму што лох ніколі ў жыцці такую назву нават не вымавіць. Нашы сучасныя мастакі вельмі розныя, настолькі, што ім, напэўна, адзін з адным няма аб чым размаўляць. Цяпер шмат людзей самі сабе займаюцца дызайнам, кожны сам сабе фатограф — я за тое, каб усе нешта рабілі. У ранейшыя часы дваране іграли на інструментах, ведалі мовы, вывучалі літаратуру і ўмелі маляваць. Глядзіш на малюнкі Пушкіна — віртуозна. Маляваць можна навучыць кожнага, хоць, можа быць, нават гэта ўжо не патрэбна — ты можаш фламастарам зрабіць дзіцячы малюнак, а ён акажацца настолькі тонкім і замілавальным, што дзякуй богу, што ты не ўмеў маляваць.

— Як вы ў савецкія часы слухалі «забароненую» музыку?

— О, у нас была добрая магчымасць — сябар-фехтавальшчык выязджаў за мяжу і прывозіў навінкі. Мы бралі віно, збіраліся і слухалі музыку на добрай апаратуры з лямпавым узмацняльнікам — ты быццам сядзіш у цэнтры аркестра, прычым ніколі не размаўлялі, пакуль пласцінка іграла, а выпівалі, замаўкалі і ўключалі. Аднойчы сябар вярнуўся з чарговай паездкі і сказаў, што прывёз амерыканскі хард-рок, і ўсе так: «Ой, ну што ты кажаш, у Штатах ніколі не было хард-рока, толькі кантры і папса». Ён уключае пласцінку, і мы разумеем, што так, амерыканцы могуць.

— Не так даўно гучаў фільм «Лета» пра піцерскіх рокераў, якія таксама захапляліся заходняй музыкай і, як мне падалося, тужылі, што не могуць быць яе часткай.

— А яны ўсе, той жа Цой, былі на пантах. Вы несяце сваю паэзію, і яна мяне кранае, але наконт музыкі — навучыцеся спачатку трымаць гітару. Калі ты брынкаеш, гэта не абавязкова музыка. Прыйшоў неяк да знаёмых у госці, выпіўка, усё — і тут яны ўключаюць караоке. Пытаюся, што будзем спяваць, і аказалася — «Ласковый май». Я кажу: «Вы што, ачмурэлі? — а яны мяне ледзь не пабілі. Памятаеце, быў такі гурт Spice Girls? — я не верыў, што ён брытанскі, думаў, масквічы жартуюць.

— Вы вядомы яшчэ і як мастак — можа, у вас захоўваюцца жывапісныя шэдэўры, а мы пра іх не ведаем?

— У мяне няма магчымасці працаваць у жывапісе: патрэбна іншая майстэрня з высокімі столямі і месцам для эксперыментаў, а мне і гэтая дасталася кроўю, і кожны год я яшчэ вяду за яе вайну. Урываецца нейкая жанчына і пытаецца: «Хто вы такі?» Я кажу: «А вы хто такая?» І пачынаецца... Чым вы тут займаецеся? Дзе вашы мальберты? Гэта мальберты? А яшчэ чым вы займаецеся? Мне не падабаецца ваш беспарадак, мы з вамі не заключым дагавор. Ужо не майстэрня на цябе працуе, а ты на яе, трэба шукаць нейкіх знаёмых, каб вырашыць пытанне — вось жыццё. Жывапіс мае патрэбу ў эксперыментах, бо з чаго складаецца адкрыццё? — мастак нешта не так зрабіў, атрымалася памылка, і нешта нарадзілася.

— Калі плакат вашага аўтарства трапіў у фонд Луўра, гэта неяк памяняла ваша прафесійнае жыццё?

— Ды ну, ты што? Яны папрасілі — я ім даў, прычым бясплатна. З Сяргеем Войчанкам у нас былі выстаўкі ў Пушкінскім і Рускім музеях, якімі насамрэч можна ганарыцца, — гэта грэе, хоць на жыццё таксама ніяк не паўплывала. Мы атрымалі шмат прэмій за мяжой — і нічога. Мне зараз далі пару прэмій у Польшчы: стаў прыслухоўвацца да адчуванняў — нічога. Неяк я пазнаёміўся з японскім дызайнерам, які на Варшаўскай біенале яшчэ за савецкім часам атрымаў першую прэмію. Ён кажа, вярнуўся ў Токіа і ўбачыў свой партрэт на ўвесь аэрапорт, яго запрасілі на прыём да імператара, прызначылі грошы — пяць гадоў можна нічога не рабіць, падарылі студыю і друкарню. Адзінае, ён сказаў, не вельмі прыемна, што студыя павінна адзін дзень у тыдзень быць адкрытай для наведвальнікаў. А мы на той біенале атрымалі Гран-пры — не расстралялі і дзякуй богу.

— Падаецца, вашая філасофія жыцця — гэта насмешка з навакольля. Што ў нашай рэчаіснасці самае смешнае?

— Тое, што мы яшчэ жывыя.

Гутарыла
Вольга МІЦКЕВІЧ.

Поўную версію інтэрв'ю чытайце на сайце zviazda.by

Выстаўка

ЁН ВЕДАЎ СЛОВА «ТАК»

Калі разглядаеш старыя здымкі, важна не толькі тое, чые вобразы яны захоўваюць. Нават у пратакольных фота савецкага часу паўстае значна больш, чым проста факт прысутнасці знаных асоб на важным мерапрыемстве. Паўстае кантэкст: як гэта тады было, што значыла. І нават стрыманая ўсмешка адказнай асобы часам вартая доўгіх аповедаў пра гісторыю нейкай падзеі. Асабліва, калі гэта ўсмешка «Містара Не», як называлі Андрэя Грамыку яго апаненты.

Сустрэча прэзідэнта ЗША Дж. Ф. Кенэдзі з міністрам замежных спраў СССР А. А. Грамыкам.

Легендарны савецкі дыпламат Андрэй Грамыка — галоўны герой выстаўкі, што працуе ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі. Сёлета адзначаецца 110 гадоў з дня нараджэння нашага земляка, ураджэнца вёскі Старыя Грамыкі (што цяпер адносіцца да Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці). Успомніць самыя плённыя гады жыцця Андрэя Грамыкі прапаноўвае праект, заснаваны на дакументах і фотаматэрыялах. Нічога, здаецца, незвычайнага — і было б дзіўна чакаць чагосьці іншага, калі гаворка пра асобу Грамыкі: прапанавана ўспомніць яго не столькі як чалавека (у коле сям'і з дзецьмі ды ўнукамі, хоць і ў гэтай частцы жыцця ён быў чалавекам паспяховым і адданым). Яго ўвасаблялі мастакі ў партрэтах. Але складана было б расказаць пра Грамыку, не прыгадаўшы час, калі ён быў пры справе.

І вось час адноўлены — праз фота, дзякуючы якім выстаўку можна лічыць адлюстраваннем эпохі. Эпохі барацьбы за мір, якая пачалася падчас Другой сусветнай вайны. Гэтую эпоху ствараліі людзі, адным з іх быў Андрэй Грамыка, які браў удзел у падрыхтоўцы Тэгеранскай, Ялцінскай, Патсдамскай канферэнцый з удзелам дэлегацый саюзнікаў. І ад імя савецкай дэлегацыі ён паставіў подпіс пад Статутам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Як гэта было, можна пабачыць на фота. Ды нават больш — уявіць, што магло быць па-за пратакольнымі здымкамі. Бо нават калі на фота Грамыка — не галоўны герой (ён часам у кадры збоку ці выглядае з-за спінаў іншых), ёсць поўнае адчуванне надзейнасці, выверанасці сітуацый. Ёсць Грамыка — усё будзе (ёсць!) добра... Мяняліся прэзідэнты ЗША, а Грамыка быў пастаянны. Вось ён у суполцы побач з прэзідэнтам Франклінам Рузвельтам (калі кавалася перамога саюзнікаў у Другой сусветнай вайне), вось разам з Гары Трумэнам (пры якім пачалося доўгае супрацьстаянне ўжо халоднай вайны), ці з Джонам Кенэдзі (з ім Грамыка сустракаўся падчас вырашэння Карыбскага крызісу, калі любое неасцярожнае слова на перагаворах магло абярнуцца вайной паміж дзвюма дзяржавамі). Гэтыя перагаворы Андрэй Грамыка лічыў самымі складанымі ў сваім жыцці. І пасля ад імя СССР ён вёў найбольш складаныя перагаворы з ЗША — за час, калі краіну ўзначальвалі прэзідэнты Ліндан Джонсан, Рычард Ніксан, Джэймс Картэр...

Легендарны міністр замежных спраў СССР быў кіраўніком савецкай дыпламатыі 28 гадоў. Пры тым што заўсёды адваёўваў лінію, якая была прынята на самым высокім узроўні, ён меў сваё меркаванне і бачанне многіх рэчаў і з'яў, ён спадзяваўся на перамены ў сваёй краіне і нават асабіста паспрыяў ім...

І ўсё ж гэта больш, чым пра Грамыку. За фотаздымкамі, якія нібыта сышлі з першых палос савецкіх газет (іх можна было тады лічыць рупарамі партыі, але цяпер яны ўспрымаюцца як летапісцы часу), чытаецца гісторыя чалавецтва наогул, якая залежыць ад асоб. Не толькі ад тых, хто на самым версе. Бо гэта быў час, калі нават савецкія школьнікі перажывалі за Кубу, пісалі лісты супраць вайны ў В'етнаме, спявалі песні пра японскіх жураўлікаў. Цяпер думаю, што мы рабілі гэта недарэмна! Бо калі нават нашы песні і лісты не даходзілі да адрасатаў наўпрост, то, магчыма, уплывалі на агульны фон, калі той жа прэзідэнт Кенэдзі не прамовіў словы «ракеты на Кубе», а савецкі міністр зразумеў, што вялікая вайна нікому насамрэч не патрэбна. На гэтым фота ён усміхаецца больш разняволена, чым на іншых — як чалавек, які любіў жыццё і разумеў, што за ім — жыцці іншых людзей.

За ім, які быў простым вясковым хлопцам, але здатным да навукі і чытання, які скончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі, але асабіста ўдзельнічаў у стварэнні ААН. У любы час патрэбныя людзі са стрыжнем, якія робяць сваю справу надзейна і з пастаянствам, па-мастацку віртуозна і гатовыя яе рабіць у любых умовах — менавіта такія ствараюць эпоху.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Вернісаж

ЗНАКІ ЛІТВІНАВАЙ

Мастачка, якую можна адкрываць бясконца. А разам з ёю — адкрыць выхад у бясконцасць мастацтва. Шыкоўны жывапіс — гэта тая галактыка, у якой сыходзяцца творы-планеты: у кожным асобны свет са сваімі колерамі, формамі, адаптаванымі пад наша зямное ўспрыманне. Адбіткі гэтых планет на нябеснай карце — гэта яе акварэлі, такія ж багатыя на вобразы і колер. Парталамі, што звязваюць з гэтай галактыкай, можна назваць графіку Літвінавай. Бо нават чорна-белыя малюнкі, накіданыя, здаецца, лёгка, за нейкае імгненне, пераносяць у свет майстэрства, дзе аўтар сваімі рукамі стварае Сусвет. Ён можа існаваць паралельна з вашым, можа перакрыжоўвацца, накладвацца на яго, узмацняючы дакладнасць ліній, якія мы малюем у сваім жыцці, ці напіваючы колерамі, якіх нестае. Асабліва напрыканцы лета, якое не атрымалася надта яркім.

Тым не менш адным з тых людзей, хто расквеціў наша лета сёлета, стала Зоя Літвінава. Асветны праект «Мастак і горад», нават калі і скончыўся на плошчы Якуба Коласа, то паклаў пачатак больш глыбокаму знаёмству з творчым космасам Літвінавай. На гэтым тыдні ёй прысвечаны адразу дзве выстаўкі, і адна дапаўняе другую.

Мемарыяльны музей-майстэрня Заіра Азгура знаёміць з праектам «Знакі творчай волі». Чыя тут воля вяршэнствуе? Стваральніка. Аўтара, вядома. Малюнак на афішы знаёміць з мастачкай: аўтапартрэт, чорным па белым. Можна сказаць, нават інтэрактыўны, таму што застанецца вобраз, які кожны глядач зможа расквеціць у сваёй свядомасці. Гэта так ці інакш захочацца зрабіць, асабліва, калі ўжо ведаеш яе жывапіс. І знойдуцца адказы на пытанні пра тое, адкуль такая нястрымная энергія. Малюнак як найлепш паказвае, якая дзіўная сіла схаваная ў руцэ гэтай жанчыны. Яна стварае свой Сусвет нават тады, калі малюе партрэты ці пейзажы — падабенства можа і мае значэнне, але саступае аўтарскай экспрэсіі.

І яшчэ больш экспрэсіі... Па яе варта пайсці ў Нацыянальны гістарычны музей, дзе ў адной з залаў сыходзяцца «Сто дарог» мастачкі, выстаўка акварэляў. І тут чакаюць адкрыцці, адно з іх — самі акварэлі, па якіх можна пазнаць жывапісца Літвінаву. Акварэль прынята лічыць лёгкім матэрыялам, на які вельмі кладуцца тонкія празрыстыя выявы. Але акварэль Літвінавай сакавітая, напоўненая фарбамі гэтак жа шчодра, як і яе алейныя палотны. А што рабіць, каб адлюстраваць далёкія і экзатычныя краіны, у якіх пабывала за жыццё мастачка? Афрыка, Азія, горы, раўніны... Гэта яе ўражанні застылі яскравымі фарбамі на паперы — здаецца, ці не выпадкова праліліся. Але насамрэч кожная колеравая пляма на сваім месцы, дапамагае захаваць аднойчы ўхопленае адчуванне нейкай мясціны. І колеры тут маюць вялікае значэнне. Афрыканскі чырвоны і чырвоны беларускі — вельмі розныя. Адзін — гарачы, такое адчуванне, што абпальвае на адлегласці. Другі — радасны і рамантычны, як водбліскі сонца, што заходзіць у хмарах.

І ўсё ж нашы колеры — больш зямныя, стрыманыя, але дазваляюць уварванне іншых адценняў, на кантрасце. І разумееш, што нават у сваёй шэрай будзённасці такіх адценняў бывае шмат — а ці фіксуем, ці паспяваем ухапіць падараванае нам яркасць? Так, каб без скаргаў на тое, што выбар фарбаў на сваім месцы абмежаваны (тымі ж прыроднымі ўмовамі), і па яркасць трэба ехаць у чужыя землі. Зоя Літвінава наведала іх шмат. І паказала: выбар фарбаў аднолькавы. Варта толькі прыкласці намаганні, каб яны распаўсюдзіліся па карціне па патрэбных нам лініях і ў неабходных прапорцыях. І можа жыццё стане такое ж яркае, як творы мудрай Зоі Літвінавай, якімі захапляюцца ў розных краінах.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Планы на ўікэнд

Прагулкі з панам Пясецкім

Едзем у Ракаў на фестываль культур

Якія жарсці: у 1921 годзе Ракаў увайшоў у склад Польшчы, аказаўся за паўтара кіламетра ад граніцы з Савецкім Саюзам і стаў цэнтрам кантрабандыстаў і агентаў спецслужбаў з рэстарацыямі, публічнымі дамамі і казіно. Гарадок на беразе Іслачы, дзе ёсць старажытнае гарадзішча, склеп, касцёлы, і сёння ўмее выкарыстаць што мае, таму заўтра, 25 жніўня, запрашае на ўжо чацвёрты Ракаўскі фэст.

Галоўнае, ліхія 1920—1930-я тут будуць у пэўным сэнсе ажыўленыя, бо на ўездзе ў Ракаў якраз падчас фестывалю плануецца адкрыць мемарыяльную дошку ў гонар рамана Сяргея Пясецкага «Каханак Вялікай Мядзведзіцы». Некалі вылучанага на Нобелеўскую прэмію рамана, дзе Ракаў, савецка-польская мяжа і кантрабандысты трапляюць у цэнтр увагі.

Фота Анатоля КІЦІЦЧУКА.

«Каханка Вялікай Мядзведзіцы» Сяргей Пясецкі напісаў за кратамі: праціўнік Саветаў, агент польскай разведкі, нарэшце, кантрабандыст, у 1927 годзе ён быў асуджаны польскай уладай на пятнаццаць гадоў зняволення і дзякуючы сваёй аўтабіяграфічнай кнізе, што стала папулярнай, выйшаў на волю раней прызначанага тэрміна.

Але далёка не Пясецкім адзіным: праграма Ракаўскага фэсту мае шырока прадставіць беларускую, польскую, яўрэйскую і літоўскую культуры і завабіць гасцей артыстамі з Беларусі, Польшчы, Літвы і Аўстрыі. Хэдлайнерамі тусоўкі стануць Лявон Вольскі і польскі гурт Tekla Klebetnica, у канцэртную праграму таксама ўвайшлі Koleżanki tego Pana з Надзеяй Бронскай, Prawdziwi mężczyźni, Czarna Perla з Мінска, спявачка Каміла Плашайска з Аўстрыі, калектыў Art Of Music з Літвы, хор Piastuny з Польшчы ды іншыя гурты, вакальныя і танцавальныя ансамблі і хоры.

З дванаццаці гадзін у Ракаве пачнуцца танцы і спевы, экскурсіі па мястэчку, запрацуюць кірмаш «Горад майстроў», мастацкі пленэр і выстаўкі, адна з якіх прысвечана Фердынанду Рушчыцу, а другая — паўсядзённаму жыццю напярэдадні вайны. Прадстаўніцтва варшаўскай мануфактуры пакажа тэхнікі Слуцкіх і Кракаўскіх паясоў, а адмысловы квэст правядзе па сцежках кантрабандыстаў.

Забаўна, як адсылкі да насычаных ракаўскіх 1920—1930-х адлюстроўваюць змену эпох: больш ніякіх «сексу, наркотыкаў, рок-н-рола». Жыццё, відавочна, стала больш «прыстойным», таму сёння Ракаўскі фэст запрашае на харавыя канцэрты ў царкве і касцёле, на чытанні вершаў беларускіх паэтаў у літаратурным дворыку ды прадстаўленне нацыянальнымі падворкамі традыцыйнай кухні. Затое завершыцца ўсё феерверкам.

Свята ствараюць Валожынскі райвыканкам, Ракаўскі сельвыканкам і пасольства Польшчы ў Беларусі. Падрабязную праграму — гугліце.

Вольга МІЦКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Организатор аукциона — Новомышский сельский исполнительный комитет Барановичского района Брестской области

Место расположения земельного участка, адрес, кадастровый номер	Характеристика инженерных коммуникаций	Площадь земельного участка, га	Назначение земельного участка	Начальная цена объекта, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона, руб.
Республика Беларусь, Брестская обл., Барановичский р-н, Новомышскийс/с, д. Гинцевичи, ул. Весенняя, участок 1. Кадастровый номер 120486001101000158	Участок свободен от застройки. Возможность подключения электроснабжения	0,1667 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	2267,12	226,71	2430,32 кроме того, плюс расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ
Республика Беларусь, Брестская обл., Барановичский р-н, Новомышскийс/с, д. Гинцевичи, ул. Весенняя, участок 2. Кадастровый номер 120486001101000152	Участок свободен от застройки. Возможность подключения электроснабжения	0,1404 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	1909,44	190,94	1920,23 кроме того, плюс расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ

Аукцион состоится 25 сентября 2019 года в 15.00 в здании Новомышского сельского исполнительного комитета деревни Новая Мышь по адресу: Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, д. Новая Мышь, ул. Парковая, д. 6.

Условие аукциона:

- наличие не менее двух участников.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь или приравненным к постоянно проживающим, в соответствии с законодательством.

Шаг аукциона к начальной цене земельного участка — 10 %.

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, предоставить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

- заверенную банком копию платежного поручения (квитанция) о внесении задатка (10 % от начальной цены);

копию документа, удостоверяющего личность, (паспорт) покупателя или его доверенного лица;

доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет до 18 сентября 2019 года включительно до 16.00 на расчетный счет № BY73AKBB36410021200401300000, филиал 802 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21802, код платежа — 04901, УНП 200047005. Адрес банка: Брестская область, г. Барановичи, б-р Штыкерау, д. 8а.

Получатель: Новомышский сельский исполнительный комитет, 225331, Брестская область, Барановичский район, деревня Новая Мышь, ул. Парковая, д. 6.

Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену.

Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

Победитель аукциона обязан: оплатить в течение 10 рабочих дней содня принятия решения о предоставлении земельного участка стоимость объекта продажи и затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона, по оформлению и государственной регистрации создания земельных участков, а также затраты, связанные с размещением извещения о проведении аукциона в средствах массовой информации.

Победителю аукциона необходимо будет произвести возмещение затрат на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной инфраструктуры к земельному участку (водоснабжение, электроснабжение, газоснабжение) путем единовременного перечисления средств в доход бюджета, в течение срока строительства дома, установленного в проектной документации с учетом индексации.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи: каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по тел.: 64-25-59, 64-25-60.

Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения.

В случае отказа или уклонения Победителя аукциона в установленный срок от внесения платы за предмет аукциона, выполнения условий, предусмотренных в протоколе аукциона, и решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона, внесенный им задаток и затраты на организацию и проведение аукциона возврату не подлежат.

Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни с 26 августа 2019 года с 8.00 по 13.00 и с 14.00 до 17.00 (Новомышский сельисполком). Последний день приема документов — 18 сентября 2019 года до 16.30. Заключительная регистрация участников аукциона – 25 сентября 2019 года с 14.30—15.00. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан:

- подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 10 рабочих дней внести плату за земельный участок и возместить затраты по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона, а также затраты, связанные с размещением извещения о проведении аукциона в средствах массовой информации (информация о затратах, порядке и сроках их возмещения по объекту, выставляемому на аукцион, доводится до сведения участников до начала проведения аукциона);

- осуществить в двухмесячный срок государственную регистрацию права собственности на земельный участок, получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; занять (освоить) земельный участок не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права собственности на него

Извещение о проведении повторного аукциона

ЗЯБРОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ проводит аукцион по продаже земельного участка в частную собственность, расположенного на территории Зябровского сельсовета

Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений	Начальная цена предмета аукциона	Затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, подлежащие возмещению победителем аукциона	Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета
321083603601000307 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома площадью 0,1125 га, Гомельская область, Гомельский район, п. Кореневка, ул. Зеленая, участок № 8	водопровод, канализация, электроснабжение, связь, асфальтированный подъезд	5587,31 (пять тысяч пятьсот восемьдесят семь рублей 31 копейка)	Расходы в сумме 1 761,51 (одна тысяча семьсот шестьдесят один рубль 51 копейка) и расходы, связанные с публикацией объявления	Задаток в сумме 558,73 (пятьсот пятьдесят восемь белорусских рублей 73 копейки) на р/с BY86AKBB36414141000113100000 в филиале № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21302, получатель – Зябровский сельский исполнительный комитет, код платежа — 4901

Аукцион проводится 4 сентября 2019 года в 15.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ильича д. 51а, в административном здании Гомельского райисполкома (малый зал, 3-й этаж).

Заявление об участии в аукционе и прилагаемые к ним документы принимаются по адресу: Гомельский район, деревня Зябровка, ул. Комсомольская, 30, 1-й этаж, кабинет 2, с даты публикации по 02.09.2019 с 8.30 до 17.00, обед 13.00—14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Условия для участия в аукционе.

Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в частную собственность по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с Зябровским сельским исполнительным комитетом соглашение установленной формы.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона, а также заключившие соглашение.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Участникам аукциона предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с членами комиссии (по предварительному согласованию).

Справки по адресу: Гомельский район, деревня Зябровка, ул. Комсомольская, 30, тел.: 94-95-45, 94-96-00

УНП 400178457

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже зданий и сооружений, принадлежащих Федерации профсоюзов Беларуси

Лот №1: 1. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер Ж 1/к) с инв. № 500/С-48316, 1983 г. п. Площадь 270,1 м². 2. Здание административно-хозяйственное (литер З 1/д) с инв. № 500/С-48317, 1983 г. п. Площадь 17,2 м². 3. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер И 1/м) с инв. № 500/С-48318, 1983 г. п. Площадь 17,8 м². 4. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер М 1/м) с инв. № 500/С-48319, 1983 г. п. Площадь 17,9 м². 5. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер Н 1/м) с инв. № 500/С-48320, 1983 г. п. Площадь 18 м². 6. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер О 1/м) с инв. № 500/С-48321, 1983 г. п. Площадь 18 м². 7. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер П 1/м) с инв. № 500/С-48322, 1983 г. п. Площадь 18 м². 8. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер Р 1/м) с инв. № 500/С-48323, 1983 г. п. Площадь 18 м². 9. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер Ф 1/м) с инв. № 500/С-48324, 1983 г. п. Площадь 14,9м². 10. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер У 1/м) с инв. № 500/С-48325, 1983 г. п. Площадь 5,9 м². 11. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер Т 1/м) с инв. № 500/С-48326, 1983 г. п. Площадь 22,8 м². 12. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер С 1/М) с инв. № 500/С-48327, 1983г. п. Площадь 18 м². 13. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер К 1/м) с инв. № 500/С-48328, 1983 г. п. Площадь 18 м². 14. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер Л 1/м) с инв. № 500/С-48329, 1983 г. п. Площадь 18 м². 15. Здание сторожевой охраны с бойлерной, литер Г 1/к с инв. № 500/С-30098, 1987 г. п. Площадь 15 м². 16. Здание склада с навесом с инв. № 500/С-30099, 1987 г. п., 1987 г. п. Площадь 689 м². 17. Здание склада, литер Б 1/к с инв. № 500/С-30101, 1987 г. п. Площадь 34 м². 18. Навес, литер В 1/м с инв. № 500/С-1382, 1987 г. п. Площадь 203 м².

Адрес Лота № 1: г. Минск, пер. Промышленный, 19. **Обременение**: здание с инв. № 500/С-48326 сдается по договору аренды по 31.12.2019.

Земельный участок: кадастровый номер 500000000002001560, площадь 0,3539 га. Право аренды по 31.12.2019. Список обременений на земельный участок на сайте Организатора аукциона ino.by.

Начальная цена с НДС — 500 000,00 бел. руб. **Задаток —** 50 000 бел. руб. **Шаг аукциона** – 5 %

Аукцион состоится 12.09.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Продавец: унитарное предприятие «Белавтотурист», 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, д. 25, тел. 8 (017) 291-07-40. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе **12.09.2019 (**Унитарное предприятие «Белавтотурист», Лот №1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений **10.09.2019** в 11.00. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 25.06.2019

Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, www.ino.by, e-mail: torgi@ino.by

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего частного предприятия «Аналитик-центр» в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит открытый аукцион по продаже дебиторской задолженности:

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена без НДС, бел. руб.	Сумма задатка (10 %), бел. руб.
1	**Дебиторская задолженность в размере 2 694,22** белорусского рубля	**2 694,22**	269,00
2	**Дебиторская задолженность в размере 28 733,17** белорусского рубля	**28 733,17**	2 873,00

Стоимость лота № 1 снижена на 90 %. Стоимость лота № 2 снижена на 10 %.

В соответствии с абзацем 4 п.1.2 Указа Президента Республики Беларусь от 05.02.2013 № 63 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)» государственная регистрация создания капитальных строений, которые выставлены на торги без наличия документов, будет осуществляться в установленном порядке по заявлению покупателя и за его счет.

Шаг аукциона — 5 (пять) процентов.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона возмещает затраты на организацию и проведение результативного аукциона.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов, в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;

- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);

- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);

- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, — доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется условиями о проведении торгов ознакомиться с которым можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **26.09.2019 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.09.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

Извещение о проведении повторных электронных торгов	
Организатор аукциона / оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703. Адрес ЭТП: **www.ipmtorgi.by**
Продавец	ООО «ВЛАДИОЛТРАНС», г. Минск, ул. Некрасова, д. 47, ком. 7, 4-й этаж, адм. пом №13
Предмет электронных торгов: административный корпус (здание административно-хозяйственное) общей площадью 5637,8 кв. м, инв. номер 610/С-17607, расположенный по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, Лошницкий с/с, аг. Лошница, ул. Рабочая, д. 1. Составные части и принадлежности: подвал, две пристройки	
Сведения о земельном участке: общ. пл. 0,6326 га предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания административного корпуса	
Начальная цена без учета НДС: 105 372, 68 бел. руб. (шаг аукциона: 5 268,63 бел. руб.)	
Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 29.06.2019	
Порядок ознакомления	Осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, Кудренок Елена Александровна, контактный телефон +375 (29) 644-38-92
Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа — ООО «ИПМ-Консалт оценка»	
Срок подписания договора купли-продажи	**15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов
Условия оплаты предмета электронных торгов	
Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но **не позднее тридцати дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов	
Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by	
Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить Организатору торгов и Продавцу затраты на их проведение, а также оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов.	
Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия	
Дата, время и место проведения электронных торгов: 10.09.2019 в 12.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**)	
Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): **09.09.2019** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**)	
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.** **E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукционов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14.

Продавец: кооперативно-торговое унитарное предприятие «Витебская универсальная база», юр. адрес: Витебский р-н, аг. Октябрьская, ул. Оршанская, 2, *почт. адрес: г. Витебск, ул. Комсомольская, 31*, факс 8 (0212) 66-42-12, 8 (029) 7133645

Лот №1. Кап. строение с инв. № 200/С-52019 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Хайсы, площадью 204,9 кв. м, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин, кондиционер Midea MSE-18HRN1,1 ед., инв. № 00171, 2011 г. в., котел отопительный КСТ-25, инв. № 4231, 2003 г. в. Имущество расположено на зем. участке площадью 0,0890 га с кадастровым № 221859151010000057. **Нач. цена**: 92 068,80 руб. с НДС. Задаток: 9 206,88 руб

Дата, время и место проведения аукциона: 24.09.2019 в 09.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и подачи заявлений на участие в торгах:** с 26.08.2019 с 8.30 по 23.09.2019 до 17.30. по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30. до 17.30. Срок подписания договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона. Условие аукциона: оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, указанные в договоре купли-продажи, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и затраты по оценке имущества на р/с, указанный в протоколе аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением правления Витебского облпотребсоюза от 14.09.2018 № 247. Для участия в аукционе представляются документы: заявление на участие в аукционе, заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка, копия документа подтверждающего гос. регистрацию (для юр. лица, индивидуального предпринимателя); копии учредительных документов (для юр. лица); легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (не ранее чем за 6 месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык (для юр. лиц — нерезидентов РБ), заключается соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. При подаче документов физ. лицо, представитель физ. лица и юр. лица предъявляет документ, удостоверяющий личность, документ подтверждающий полномочия лица на представление интересов (для представителя). Осмотр предметов торгов осуществляется в рабочие дни с 8.30. до 17.00. по месту нахождения имущества по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375 (29) 7133645, +375 (212) 66-42-12. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. **Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа — ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Организатор аукциона вправе не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информация по тел: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БРЕСТСКИЙ ЭЛЕКТРОТЕХНИЧЕСКИЙ ЗАВОД»

Предмет торгов — Лот:

1) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-28842 (наименование: механический цех; назначение: здание специализированное для производства электротехнического, электронного и оптического оборудования), площадью 945,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1/3, механический цех, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001010166, площадью 1,0055 га.
Составные части и принадлежности: кабель АВБ 3х120+1х50, кабель АПВБ 3х150+1х75.

2) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-28853 (наименование: здание веерное; назначение: здание специализированное железнодорожного транспорта), площадью 928,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1, здание веерное, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001010166, площадью 1,0055 га.
Составные части и принадлежности: две пристройки, подъездной ж/д путь, подкрановый путь, покрытие из бетонных плит, ограждение железобетонное, двое ворот металлических ограждение из ж/б плит на ж/б столбах, кабель АВБ 3х120+1х50;

3) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-5048 (наименование: склад; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 233,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1/6, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001010166, площадью 1,0055 га.

4) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-28849 (наименование: уборная; назначение: здание специализированное иного назначения), площадью 5,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1/2, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001010166, площадью 1,0055 га.

5) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-28836 (наименование: проходная; назначение: здание специализированное иного назначения), площадью 26,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1/1, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001010166, площадью 1,0055 га.

6) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-28847 (наименование: компрессорная; назначение: здание специализированное иного назначения), площадью 33,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1/4, компрессорная, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001010166, площадью 1,0055 га.
Составные части и принадлежности: кабель АПРГ 3х50+1х25;

7) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-89905 (наименование: тепловая сеть; назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 21,0 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1/1, тепловая сеть.
Составные части и принадлежности: участок тепловой сети;

8) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-89906 (наименование: тепловая сеть; назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 18,6 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1/4, тепловая сеть.
Составные части и принадлежности: участок тепловой сети;

9) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-89907 (наименование: сети питьевого водоснабжения; назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 15,7 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1/3, сети питьевого водоснабжения.
Составные части и принадлежности: два трубопровода;

10) Капитальное строение с с инвентарным номером 100/С-89908 (наименование: сети технического водоснабжения; назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 65,4 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1, сети технического водоснабжения.
Составные части и принадлежности: участок сети технического водоснабжения

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	**368 131,00**	**Размер задатка, руб.**	**36 813,10**

Продавец: ОАО «Брестский электротехнический завод», г. Брест, ул. Строительная, 56, УНП 200215500.

Организатор торгов: Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».

Реквизиты для перечисления задатка: р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245.

Обременения: на земельном участке с кадастровым номером 140100000001010166, расположенном по адресу: Брестская обл., г. Брест, пер. Фортечный, 1, расположено капитальное строение с инвентарным номером 100/С-83788 (наименование: тепловая сеть (часть 2); назначение: сооружение коммунального хозяйства), протяженностью 149,5 м, переданное ОАО «Брестский электротехнический завод» по договору безвозмездного пользования имуществом.

Срок заключения договора купли-продажи: в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Условия продажи: без условий. **Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи

Аукцион состоится 25 сентября 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329, в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, можно узнать у организатора аукциона по телефонам 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52

Последний день приема заявлений — 24 сентября 2019 г. до 17.00

* Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20 % от продажной стоимости объекта, вознаграждение Организатору аукциона.

Дзівакі

ЛЮСТРАНЫ СВЕТ СЯРГЕЯ ЛАБКОВА

Як карэспандэнт «Звязды» вучылася размаўляць... на разбойніцкай мове

Памятаеце добры савецкі фільм «Дзе знаходзіцца нофелет», герой якога знаёміўся з дзяўчатамі, прагаворваючы словы задам наперад? Калі даведалася, што ў Магілёве ёсць чалавек, які валодае такімі здольнасцямі, адразу ж напрасілася на сустрэчу. Кажуць, што амбідэкстраў, як яшчэ называюць такіх людзей, адзін на мільён. Лічы, мне пашчасціла.

ОНВАД С УНОД

Каб я не сумнявалася, што ён умее гаварыць наадварот, Сяргей сходу прапануе агучыць любы тэкст. Я бяру з рабочага стала першае, што трапляе ў рукі, чытаю: тэматычнае планаванне на трэці квартал... «Еоксечитамет еинавариналп ан йитерт латравк» з ходу перакладае ён рускі варыянт. Пакуль я ў шоку, ён расказвае з чаго ўсё пачалося.

— У дзяцінстве я шмат чытаў, у класе сёмым прачытаў «Пятра Першага» Талстога і захапіўся ... разбойніцкай мовай, — расказвае Сяргей. — Памятаеце, там ёсць такая фраза «онвад с унод». Гэта былі словы з размовы разбойнікаў «далеко с Дону». Пасля гэтага мне хацелася кожнае слова прачытаць задам наперад: манітор — ротінам, ручка — акчур і гэтак далей. Хутка гэта стала атрымлівацца ў мяне з лёту. Маёй гульнёй захапіўся ўвесь клас. Нехта спецыялізаваўся выключна на лаянках. У перагорнутым выглядзе яны гучалі не так груба і крыўдна. Нехта вывучыў усяго некалькі слоў, каб дзесьці бліснуць у размове. Але так натхнёна і хутка, як гэта рабіў я, ніхто з класа паўтарыць не мог.

Аднойчы ў школе быў конкурс «The best pupil» і трэба было бліснуць талентамі. Нехта пёк, нехта танчыў, нехта вершы дыкламаваў. А Сяргей Лабкоў прачытаў «Бура імгою неба крые» наадварот. Слухаю, як гэта гучыць у яго выкананні, і здаецца, што суразмоўнік гаворыць на нейкай незразумелай мове. Потым ён бярэцца за Маякоўскага «Я воўкам бы выгрыз бюракратызм». Вуха рэжуць рэзкія гукі, накшталт дз і бз. Зусім па-іншаму пачынаеш успрымаць савецкага паэта.

— Калі я выступаў са школьнай сцэны, уся зала была ў захапленні, — успамінае суразмоўнік. — І я, каб замацаваць свой поспех, прапанаваў перакласці любое слова. Што тут пачалося. Крычалі наперабой адно слова складаней другога: эмансіпацыя, сінхрафазатрон, калектывізацыя. А я ўсё з лёту «перакладаў». Практыка ў мяне тады была пастаянная.

Сябры неаднаразова прапаноўвалі таварышу прадэманстраваць свае здольнасці на нейкай тэлепередачы. Але ён сціпла адмаўляўся. І ўсё ж знаёмцца з дзяўчатамі, як кіношнаму герою Панкратава-Чорнага, незвычайная мова сапраўды дапамагала.

— У нас была своеасаблівая гульня, хто болей возьме тэлефонаў у дзяўчат, — расказвае Сяргей. — Мабільных тады яшчэ не было, нас цікавілі менавіта хатнія. І нават не для таго, каб спатканні назначаць, а так, дзеля спартыўнага інтарэсу. Мне шчасціла болей, чым каму. А фільм «Дзе знаходзіцца нофелет», які якраз выйшаў на экраны ў той час, мяне яшчэ больш натхняў. Мне падабалася, як гучыць маё імя наадварот — Йегрес. Так і знаёміўся. Галоўнае, спачатку шакіраваць чалавека.

КАЛІ НЕ ВЕДАЕШ, ШТО СКАЗАЦЬ, КАЖЫ ПА-ФРАНЦУЗСКУ!

Памятаеце гэтую цудоўную непараўнальную ні з якой іншай казку пра Алісу ў краіне цудаў Льюіса Кэрала. «Задам наперад, зусім наадварот!» — пісаў аўтар аб прыгодах сваёй маленькай цікаўнай гераіні ў Залюстроўі, дзе «заўтра ніколі не бывае сёння», а з пальца пачынае ісці кроў яшчэ да таго, як ён быў паранены.

Я так і думала, суразмоўнік, нягледзячы на свой ужо далёка не дзіцячы ўзрост, натхненне працягвае чэрпаць у фэнтэзійнай літаратуры.

— Калі трэба ад чагосьці абстрагавацца, адкрываю кнігу Ніка Перумава і цалкам пагружаюся ў яе, — кажа ён. — Глядацкае ўяўленне ў мяне добрае, вельмі цікавыя карцінкі малюе.

Дарэчы, малодшы сын Лабкова, які хутка пойдзе ў школу, таксама дапытлівы. У свае шэсць гадоў ён наведвае бібліятэку, ахапкамі бярэ літаратуру і амаль «праглынае» яе.

— Зараз чытае серыю кніг пра Карандаша і Самадзелкіна — па 80 старонак за дзень, а тэкст там не вельмі просты, крыху нават навуковы, — расказвае Сяргей Лабкоў. — А яшчэ вывучыў электронную энцыклапедыю Чагосціка. Прыехалі сёлета ў Рым, а ён: тата, а ты ведаеш на якім узвышшы стаіць трэці горад? І сам адказвае — галоўнае было Палаційскае. Потым паведаміў, што Рым узнік на рацэ Тыбр, а заснавалі яго браты Рэм і Ромул. Калі снедалі, на сцяне ўбачылі ладную яшчарку. Я, каб дзеці не спужаліся, паспрабаваў іх папярэдзіць, а малы толькі адмахнуўся — гэта ж бекон, насценная яшчарка. Наогул гекон, ён крыху перабылтаў, але ж я нават загнарыўся ім. Дарэчы, марыць быць вучоным.

ШТО АГУЛЬНАГА Ў МАРКЕТЫНГУ І ЦЫГАН

Па прафесіі Сяргей эканаміст, выкладае маркетынг у Магілёўскім універсітэце харчавання. Сваё «галоўнае — спачатку шакіраваць чалавека» прымяняе і тут. Сказануць нешта задам наперад таксама можа, але толькі для таго, каб разрадзіць абстаноўку. А вось, каб зразумелі матэрыял, трэба выкарыстоўваць іншыя прыёмы.

— Каб цалкам захапіць увагу чалавека, трэба ўстанавіць з ім зрокавы, слыхавы і тактыльны кантакты, — інструктуе ён. — Па гэтым жа прынцыпе працуюць рэклама і цыгане. Падыходзяць у нечым стракатым і пачынаюць шаптаць: хвароба, падробка, сурокі. Людзі пачынаюць напружвацца, услухоўвацца. Шанц збегчы ёсць, пакуль вас не ўзялі за руку. Калі ўзялі і сказалі, дай пагадаю — вы прапалі. Мне заўсёды цікава назіраць, як дзейнічаюць тыя ж агенты па продажах. У адрозненне ад іншых, я іх выслухоўваю да канца. Потым... ветліва адмоўлю. Яны не разумеюць чаму. А мне чыста з прафесійнага пункту погляду цікава, як яны адпрацавалі.

Маркетынг захапляе суразмоўніка не меней, чым калісьці жаданне вывучыць «люстэркавую» мову. Большасць успрымае гэтую навуку, як купіць-прадаць, але гэта толькі вяршыня таго, што яна з сябе ўяўляе. Гэта тая ж эканоміка, масівы лічбаў, аналітыка.

— Ва ўніверсітэце я працую для душы, а зарабляю грошы іншымі спосабамі, — прызнаецца выкладчык. — Як эканаміст, я ўсё пралічваю, раблю даследаванні, падказваю перспектыву. Бярэцца за любыя тэмы. Апошні раз працаваў з сур'ёзнымі заказчыкамі з Масквы. Тэма — выкарыстанне цвыркноў для харчовых мэт. Гэта ж 70 % бялку. У нас пад Мінскам таксама ёсць такая ферма. Але адна справа вырасціць, іншая перапрацаваць.

АДНОЙ ЛЕВАЙ

Пра амбідэкстраў кажуць, што гэта людзі ўнікальных здольнасцяў, у якіх абодва паўшар'і мозга развітыя аднолькава. Яны добра валодаюць левай і правай рукамі. Сяргей Лабкоў піша правай, але адразу ж папярэджвае, што ён перавучаны ляўша. Усё астатняе ён робіць менавіта левай. Напэўна, і пісаў бы левай, калі б у Савецкім Саюзе такіх дзяцей не перавучвалі. Ёсць меркаванне, што людзі са здольнасцямі казаць наадварот могуць з лёгкасцю авалодаць замежнымі мовамі. Сяргей прызнаецца, што нядрэнна ведае англійскую і хутка назапашвае слоўнікавы запас у той краіне, куды прыязджае. А падарожнічаць ён вельмі любіць. Прычым на сваёй машыне. Раз у год разам з жонкай і сынам яны абавязкова адпраўляюцца ў далёкія вандроўкі.

— Летась, напрыклад, ездзілі ў Албанію — тры тысячы кіламетраў туды, тры тысячы назад, — удакладняе ён. — Гэта вельмі цікава, калі ты перасякаеш межы шасці краін і на тваіх вачах усё мяняецца. У Чэхіі жыве мой найлепшы сябра. Ён славак, вучыўся на Кубе ў рускай школе. З ім мы размаўляем на любыя тэмы. Людзі звычайна абмяжоўваюць сябе нейкімі рамкамі і робяць сваё жыццё шэрым і аднастайным. Так быць не павінна. І я тут цалкам згодны са сваім прыяцелем: у жыцці ўсё проста і нічога складанага няма. Галоўнае, у гэта паверыць.

ГАСПАДЫНЯМ НА ЗАМЕТКУ

— Люблю пячы, — агарошвае Сяргей Лабкоў і дэманструе ў тэлефоне фота торта, які «змайстраваў» на дзень нараджэння сына. — Жонка гатуе сур'ёзныя стравы, а я ў сваё задавальненне пяку, на што будзе настрой. Дзеці вельмі любяць мой яблычны пірог. Бяру тры яйкі, узбіваю са шклянкай цукру і шклянкай мукі. Узбітым цестам заліваю яблыкі і адпраўляю ўсё гэта ў духоўку. Прасцейшага рэцэпта няма. Смачна есці!

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

ПРЫЦЯГНЕННЕ СУПЕРВОСТРАВА

Чым прывабная Грэнландыя?

Адной з «топавых» навін на працягу апошняга тыдня стала зацікаўленасць прэзідэнта ЗША ў куплі вострава Грэнладыя. Цяпер гэтая аўтаномная тэрыторыя ўваходзіць у склад Каралеўства Данія. Як паведаміла The Wall Street Journal, амерыканскі лідар неаднаразова высвятляў падчас сустрэч, абедаў і проста мімалётных размоў, ці могуць Злучаныя Штаты набыць гэтую частку сушы, і нават папрасіў свайго адваката ў Белым доме вывучыць ідэю. Пазней Дональд Трамп пацвердзіў журналістам, што насамрэч цікавіўся купляй вялізнага вострава. Па яго словах, «стратэгічна гэта цікава». Амерыканскі лідар адзначыў, што ЗША і Данія — добрыя саюзнікі. «Па сутнасці, гэта буйная здзелка з нерухомасцю», — заўважыў Трамп. Чым жа такая прывабная закаваная ў лядовы панцыр Грэнландыя?

«БРЭНД» ЭРЫКА РУДАГА

Грэнландыя — самы вялікі ў свеце востраў, плошча якога складае больш за 2,1 мільёна квадратных кіламетраў (працягласць 2 690 кіламетраў з поўначы на поўдзень). Ён знаходзіцца паміж Атлантычным і Паўночным Ледавітым акіянамі. Адметна, што геаграфічна Грэнландыя з'яўляецца часткай Паўночнай Амерыкі, аднак палітычна і культурна звязана з Еўропай. Вялікая частка супервострава пакрыта льдамі, якія ўтвараліся яшчэ ў апошні ледавіковы перыяд, каля 11 500 гадоў таму. Іх таўшчыня дасягае 3,4 кіламетра, больш важкі панцыр толькі ў Арктыкі. Усяго 15,7 працэнта плошчы вострава свабодная ад ільдоў.

Паводле адной з версій, ён быў адкрыты ісландскім маракам Гунб'ернам каля 875 года. А першае даследаванне ў 982-м здзейсніў вікінг Эрык Торвальдсан (Руды), які быў прысуджаны да трохгадовага выгнання з Ісландыі. Ён назваў гэтае месца «Зялёнай зямлёй» (даслоўна Gronland). Чаму менавіта так? Наконт гэтага існуе некалькі тэорый. Згодна з першай, у тыя часы клімат у тамтэйшых мясцінах быў мяккі, і прыбярэжныя раёны паўднёвага захаду вострава пакрывала густая расліннасць. Згодна з другой тэорыяй, Грэнландыя была названая так з адзінай мэтай — прыцягнуць сюды больш пасяленцаў. Дзякуючы ўдаламу «брэнду» Эрык падбухторыў землякоў выправіцца ў экспедыцыю і ў 986-м 25 караблёў з эмігрантамі і жывёлай адплылі з Ісландыі ў Грэнландыю, але да вострава змаглі дабрацца толькі 14 суднаў. На іх прыбылі 350 чалавек, якія заснавалі на востраве калонію Eystribyggd («Усходняе паселішча»). Каланізацыя Грэнландыі датчанамі пачалася ў XVIII стагоддзі, у 1814 годзе востраў быў абвешчаны дацкай калоніяй, а ў 1953 быў уключаны ў склад Дацкага каралеўства. Разам з Данiяй у 1973 увайшоў у Еўрапейскую супольнасць (пазней стала Еўрапейскім саюзам), аднак у 1985 годзе выйшаў з ЕС з-за нязгоды па квотах на рыбную лоўлю.

Насельніцтва Грэнландыі цяпер складае каля 57 тысяч чалавек, з іх каля 90 працэнтаў — інуіты (эскімосы). Фактычна востраў — гэта высокае нагор'е з прыўзнятымі бакамі, пакрытае мацерыковым лёдам. Летам снег растае толькі ў вузкай — шырынёй ад 10 да 150 км — прыбярэжнай паласе агульнай плошчай 327 тысяч кв. км, на якой і засяроджана ўсё насельніцтва Грэнландыі. На аднаго жыхара прыпадае амаль 15 квадратных кіламетраў тэрыторыі, свабоднай ад лёду. Рэкі прыбярэжнай паласы кароткія і хуткія, маюць вялікія запасы гідраэнергіі. Азёры ўскрываюцца на вельмі кароткі перыяд. Языкі шматгадовага лёду — глэтчары — спаўзаюць з нагор'яў па фіёрдах, утвараючы на вадзе айсбергі. Сувязь па моры з паўднёва-заходнім узбярэжжам Грэнландыі магчымая з ліпеня да кастрычніка. Да ўсходніх берагоў суднам удаецца падысці не кожны год з-за цяжкіх дрэйфуючых ільдоў. На клімат прыбярэжнай паласы Грэнландыі аказваюць уплыў адгалінаванні цёплага цячэння Атлантычнага акіяна — Гальфстрыма. Сярэдняя тэмпература самага халоднага месяца змяняецца ад мінус 37,5 градуса Цэльсія на поўначы да мінус 7,5 градуса на поўдні, а самага цёплага — адпаведна ад плюс 2 да 9,7.

ДЗЯРЖАВА ІНУІТАЎ

Грэнландыя — аўтаномная тэрыторыя, якая ўваходзіць у склад Каралеўства Данія. Кіраўніком дзяржавы з'яўляецца каралева. Рэальны статус аўтаноміі гэтая тэрыторыя атрымала толькі ў 1979 годзе, калі частка адміністрацыйных функцый перайшла да мясцовых органаў улады, якія змаглі незалежна дзейнічаць у 17 сферах кіравання, якія датычацца ў асноўным сацыяльнай палітыкі, аховы здароўя, адукацыі. У 2008 годзе адбыўся рэферэндум, падчас якога грэнландцы прагаласавалі за новы Закон аб самакіраванні, які даў мясцовым уладам яшчэ больш паўнамоцтваў. У прыватнасці — кантроль над судовай і пенітэнцыярнай сістэмамі, а таксама над паліцыяй. Акрамя таго, па новым законе Грэнландыя займела права на атрыманне даходаў ад здабычы карысных выкапняў, перш за ўсё нафты. Грэнландцам таксама ўдалося дасягнуць пагаднення з Данiяй, згодна з якім жыхары выспы абвяшчаюцца самастойным народам, якія маюць права на нацыянальнае самавызначэнне і незалежнасць, што ў перспектыве можа азначаць стварэнне ўласнай дзяржавы. У кампетэнцыі Данiі засталіся пытанні, якія датычацца абароннай, знешняй і грашовай палітыкі.

Пасля таго як кіраванне перайшло да грэнландскага парламента (лансцінга) і ўрада (лансцюрэ), была праведзена замена асноўных дацкіх тапонімаў на эскімоскія, паколькі інуіты з'яўляюцца карэнным і дамінуючым насельніцтвам гэтага вострава. Грэнландыя пачала называцца Калаліт Нунаат («Зямля Калалітаў»), а сталіца Готхаб — Нук. Правінцыі Паўночнай, Усходняй і Заходняй Грэнландыі таксама былі перайменаваныя адпаведна ў Аванаа, Туна і Кітаа. Каралеву Данiі Маргрэтэ II на востраве прадстаўляе вярхоўны камісар Макаэла Энгель, кіраўніком урада з'яўляецца былы марак і паліцэйскі Кім Кільсен.

БУЛЬБА, НАФТА І ЎРАН

Цяпер асноўныя артыкулы даходаў вострава — субсідыі дацкага ўрада (штогадовыя датацыі складаюць каля 600 мільёнаў долараў — палова гадавога бюджэту Грэнландыі), а таксама экспарт рыбы і крэветак. Змяненне клімату, выкліканае павышэннем тэмпературы ў водах Атлантычнага акіяна, дазваляе вырошчваць на востраве сельскагаспадарчую прадукцыю. Земляробства ў Грэнландыі пакуль распаўсюджана толькі на самым поўдні. Тут знаходзіцца ўчастак у 40 гектараў, на якім вырошчваюць бульбу і капусту. Агародніну саджаюць у маі, а збіраюць ураджай у кастрычніку. Некаторым аграрыям удалося вырасціць бабы, гарох, зеляніну і нават клубніцы. Але асноўнай крыніцай даходу для мясцовага насельніцтва, зразумела, з'яўляецца паляванне і рыбалоўства. На востраве жывуць белыя мядзведзі, на іх палююць дзеля футра, а таксама жоўці і тлушчу, з якіх вырабляюць лекавыя прэпараты. Акрамя таго, у гэтым раёне вялікая колькасць прамысловай рыбы.

У Грэнландыі засяроджаны адны з найбуйнейшых у свеце радовішчаў рэдказямельных металаў, уключаючы неадым, празеадым, дыспрозій і тэрбій, а таксама ўран і пабочныя прадукты цынку. Як адзначаюць аналітыкі, адна з магчымых мэт ЗША — кампанія Greenland Minerals, якая выклікала вялікі ажыятаж з таго часу, як пачала праца-ваць на паўднёва-заходнім паўвостраве Грэнландыі ў 2007 годзе для распрацоўкі рудніка Kvanefjeld, багатага рэдказямельнымі металамі, піша The Guardian. Мяркуецца, што больш за 100 мільёнаў тон руды знаходзіцца пад зямлёй, і чакаецца, што праект стане адной з найбуйнейшых сусветных вытворчасцяў за межамі Кітая.

Акрамя таго, ЗША цікавыя прывабныя радовішчы нафты на шэльфе Грэнландыі. Упершыню запасы сыравіны на востраве былі выяўленыя ў 2010 годзе. Тады брытанская кампанія Cairn Energy паглыбілася на першую свідравіну. Але суровыя ўмовы надвор'я дазволілі выконваць работы ўсяго чатыры месяцы ў годзе, што вымусіла карпарацыю пакінуць рэгіён. Аднак летась Нацыянальная геалагічная служба ЗША правяла аналіз нетраў вострава. Амерыканскія інжынеры выявілі на шэльфе значныя запасы, прыкладна 50 мільярдаў бараляў, нафты — супастаўна з Лівіяй. Грэнландыя дзякуючы раставанню ледавікоў у прамым сэнсе падымаецца з-пад вады — гэты феномен вядомы навукоўцам і звязаны з тым, што цяжкая маса лёду ўціскае зямлю ўглыб. Праз 50 гадоў востраў, магчыма, стане ў літаральным сэнсе слова «зялёнай краінай». І багатыя радовішчы стануць больш даступныя.

ЛЯДОВЫ ЧАРВЯК

З ваеннага пункту гледжання ЗША даўно выкарыстоўваюць Грэнландыю як частку сваёй глабальнай супрацьракетнай абароны. У 1952 годзе на востраве была пабудавана адна з самых буйных авіябаз ЗША — Туле. Гэты найважнейшы стратэгічны аб'ект знаходзіцца за 1 118 км на поўнач ад Палярнага круга і за 1 524 км ад Паўночнага полюса. Тут размешчаны стратэгічныя бамбардзіроўшчыкі з ядзернай зброяй на борце і магутная радыёлакацыйная станцыя ранняга папярэджання. Доступ да базы магчымы толькі па паветры і моры (порт прымае каля трох месяцаў у годзе). Каб вызваліць месца для будаўніцтва базы, дацкі ўрад выцесніў супольку інуітаў (эскімосаў). Карэнных жыхароў вострава «бесцырымонна адправілі на 65 міль на поўнач у паселішча Нью-Туле, выдаўшы ім коўдры, палаткі і «самыя лепшыя пажаданні», піша гісторык Данiэль Імервар у кнізе «Сапраўдная гісторыя Вялікіх Злучаных Штатаў».

У 1968 годзе пры заходзе на пасадку тут разбіўся B-52 з ядзернай зброяй на борце. Стратэгічны бамбардзіроўшчык упаў на лёд заліва Паўночнай зоркі за 11 кіламетраў ад авіябазы. У выніку ўдару адбыўся выбух усіх чатырох бомбаў, падпалённае паліва праплавіла шматметровы лёд і радыеактыўныя абломкі пайшлі на дно. У гады халоднай вайны ЗША запусцілі ў Грэнландыі праект «Лядовы чарвяк» (Project Iceworm). Мэта — размяшчэнне мабільных ядзерных ракетных стартавых пляцовак пад ледзяным шчытом. Планавалася стварыць сістэму тунэляў даўжынёй 4 тысячы кіламетраў і разгарнуць 600 ядзерных ракет. Пры поўнай загрузцы ў падлёдным цэнтры павінны былі пражываць 11 тысяч ваенных. Да закрыцця праекта ў 1966 годзе паспелі пракласці 21 тунэль, агульнай працягласцю 3 км, пад лёдам узвялі краму і царкву. Цяпер аб'екты недаступныя, тунэлі засыпала амаль адразу пасля прыпынення эксплуатацыі.

НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Трамп назваў Грэнландыю абузай для Данiі. Аднак насамрэч усё, мякка кажучы, не зусім так. Датацыі далёкага вострава не перавышаюць паўпрацэнта бюджэтных выдаткаў. Данія ўваходзіць у дзясятку найбагацейшых краін свету, а яе даўгі — толькі траціна ВУП. А вось запазычанасць ЗША перавышае валавы ўнутраны прадукт краіны. Амерыканцы павінны больш за 22 трлн долараў, і гэтая сума не змяншаецца. У бюджэце краіны дзірка ў $1 трлн у год, і пакрываць яе прыходзіцца за кошт пазыковых сродкаў.

«Грэнландыя не прадаецца. Грэнландыя не належыць Данiі. Грэнландыя належыць Грэнландыі, — адказала на задумы Трампа прэм'ер-міністр Данiі Метэ Фрэдэрыксен і назвала гэтую ідэю абсурднай. — Я вельмі спадзяюся, што гэта ён не сур'ёзна». У адказ прэзідэнт ЗША адклаў свой візіт у Данію, які было запланавана здзейсніць у верасні.

У артыкуле часопіса Time за 1947 год Грэнландыю назвалі «найбуйнейшым у свеце астраўным стацыянарным авіяносцам». Хуткае раставанне льдоў для навукоўцаў — пагроза клімату, а для палітыкаў — новыя магчымасці. Як заявіў дзяржсакратар ЗША Майк Пампеа, у такім разе маршрут паміж Азіяй і Захадам скароціцца на цэлых 20 дзён. Арктычныя марскія шляхі могуць стаць «Суэцкім і Панамскім каналамі XXI стагоддзя». Раставанне льдоў таксама палегчыць доступ да карысных выкапняў. Як цяпер адзначае той жа Time, эксперты добра разумеюць: усе гэтыя новыя магчымасці могуць прывесці да таго, што тэрыторыя вакол Грэнландыі стане месцам «палітычнага крызісу XXI стагоддзя». Зрэшты, першыя яго прыкметы мы ўжо назіраем.

Захар БУРАК.

МЕСЦА ВЕРЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Як мясцовы падкажыце: што тут абавязкова трэба ўбачыць ці зрабіць?

— Усё залежыць ад таго, з якой мэтай чалавек прыязджае. Турыстам лепш за ўсё замовіць экскурсію і пазнаёміцца з архітэктурай манастыра — яна сапраўды ўнікальная і хавае шмат таямніц. Ёсць тыя, хто імкнецца ў Жыровіцы, каб вырашыць жыццёвыя пытанні: напрыклад, з пэўнай просьбай да цудадзейнай іконы ці каб акунуцца ў крынічную ваду. І гэта таксама трэба. Але я раю ўсім праваслаўным вернікам не спяшацца і не ператвараць свой візіт у фармальны рытуал. Лепш вылучыць цэлы дзень, можа, нават не адзін, і абавязкова схадзіць на споведзь і прычасце. У чым сутнасць жыцця з пункту гледжання хрысціяніна? Ператварыць жыццё часовае ў вечнае. Як гэта зрабіць? Па адказ чалавек ідзе ў царкву, якая дапамагае далучыцца (прычасціцца) да Хрыста сваім двухтысячагадовым досведам і таінствамі. Глыбокія ўнутраныя адносіны чалавека з Богам, у якіх ён для сябе адкрывае, па слове самога Хрыста, шлях, ісціну і жыццё, — вось і адказ на вечнае пытанне «Навошта жыву?» — дзеліцца манах. — Асаблівасць нашага манастыра ў тым, што тут даволі вялікая колькасць кампетэнтных святароў, якія кожнаму прыхаджаніну могуць удзяліць столькі часу, колькі патрабуецца, падрабязна адказаць на пытанні. У нас, напрыклад, усе маюць багаслоўскую адукацыю. Ёсць тыя, хто спецыялізуецца на асобных праблемах. Чаму б не скарыстацца магчымасцю звярнуцца да іх? Выратаванне душы можна параўнаць з рэстаўрацыяй іконы. Калі за справу возьмецца той, хто толькі пагартаў самавучыцель, хутчэй за ўсе нічога путнага не атрымаецца. Іншая справа — вопытны майстар, які пераняў сакрэты рэстаўрацыі ад папярэднікаў...

На споведзь у той дзень я не трапіла, але ясна, што наступная паездка ў манастыр дакладна будзе не на турыстычным аўтобусе.

Што раўняла каралёў і жабракоў

Зусім маленькая і непрыкметная на першы погляд Жыровіцкая ікона Божай Маці — нерукатворная выява на невялікім камені — прыцягвае да сябе сотні тысяч вернікаў штогод. У цудадзейнай сіле абразка людзі пераконваюцца на працягу амаль 550 гадоў. Ікона выратала да жыцця, вылечвала безнадзейна хворых, дарыла дзетак, але самае галоўнае — была і застаецца заступніцай манастыра. Нягледзячы на разбуральныя войны, страшныя эпідэміі, глупства і прагнасць да матэрыяльных каштоўнасцяў, манастыр ніколі не зачыняў свае дзверы. Што сведчыць не толькі пра непарыўнасць хрысціянскай веры на беларускай зямлі, але і пра захаванне духоўнай і культурнай спадчыны нацыі.

— Манастыр, а пасля і семінарыя пры ім прыцягвалі найразумнейшых людзей свайго часу — першых асоб краін, вучоных, дзеячаў культуры. Усё гэта знайшло адбітак у гісторыі, з якой цяпер можна бліжэй пазнаёміцца ў невялічкім семінарскім музеі, — расказвае Піліп Юнашаў, які якраз і навучаецца на 4-м курсе Мінскай духоўнай семінарыі.

Экспазіцыя прыемна здзіўляе шырынёй канцэпцыі. Аб'ектыўна адлюстроўвае гісторыю манастыра ад самага заснавання: пачынае са знаходжання цудадзейнай іконы праваслаўнымі, раскрывае няпросты ўніяцкі перыяд, не хавае падрабязнасцяў супрацьстаяння рэлігій і атэізму ў XX стагоддзі і працягвае папаўняцца незвычайнымі экспанатамі нашага часу.

— Вось хрысціянскія нацельныя крыжыкі дамангольскага перыяду Русі, а тут іконы, характэрныя для Заходняй Еўропы. Ёсць старажытныя кнігі на класічных мовах — грэчаскай і лацінскай, а таксама ўнікальныя фаліянты на царкоўнаславянскай, сярод якіх — асобнік «Апостала» Івана Фёдарава, выдадзены ў Львове ў 1574-м, — расказвае пра артэфакты Піліп. — Калі ласка, драўляная скульптура «Пакутуючы Хрыстос» сярэдзіны XVIII стагоддзя. Гэта каталіцкая традыцыя. Побач з ёй — узор праваслаўнай лампады з дароўным надпісам: «В память чудесного спасения их Величества государя императора и его семьи 17 октября 1888 года». Аляксандр III ледзь не загінуў пры крушэнні цягніка.

Кожная рэч невыпадковая, мае дачыненне да манастыра, а ўсе разам яны раскрываюць няпростыя міжканфесійныя стасункі ў гісторыі беларусаў.

— А гэта што на сценах? — пытаюся ў семінарыста, пазіраючы на загадкавы драўляны дэкор, ад якога павявае мінуўшчынай.

— Фрагменты іканастаса 1730 года з Успенскага сабора. У нас нічога не знікае бясследна, — заўважае хлопец. — Хоць, на жаль, спробы разбурыць манастыр былі. Напрыклад, у сярэдзіне XVII стагоддзя, калі абіцель перайшла ў валоданне ўніятаў, яе атакавалі войскі Багдана Хмяльніцкага. Напамін пра гэта — гарматныя ядры ў экспазіцыі. Першая і Другая сусветныя войны таксама пакінулі свой след. Літаральна днямі будаўнікі знайшлі на тэрыторыі нямецкую гранату. Чулі? Аднак дзіўная рэч: як ні імкнуліся захопнікі ўзарваць храмы манастыра, нічога не атрымалася.

Варта зазначыць, што Жыровіцкая ікона Божай Маці аб'ядноўвае хрысціян розных канфесій. Пакланіцца святыні прыязджаюць як праваслаўныя, так і каталікі. Прыходы ў яе гонар існуюць у Еўропе, Паўночнай Амерыцы і нават Аўстраліі. Слава пра цудадзейную ікону распаўсюдзілася амаль адразу пасля яе з'яўлення. Прасіць у яе выратавання ці заступніцтва заўсёды ішлі не толькі беларусы, але і рускія, палякі, літоўцы, украінцы.

— Перад Жыровіцкай іконай усе роўныя: на калені апускаліся простыя людзі і каралі. Пасля візіту ў манастыр Уладзіслава IV і яго жонкі Цэцыліі з'явілася памятная дошка, часцінка якой захоўваецца ў музеі, — расказвае Піліп.

У экспазіцыі музея ёсць рарытэтны інструмент — фісгармонія пачатку XX стагоддзя. Абавязкова прасіце экскурсавода прадэманстраваць яе ў справе.

Нягледзячы на тое, што Жыровіцы заўсёды былі месцам правінцыйным, нікому і ў галаву не прыходзіла перанесці ікону, напрыклад, у сталіцу. Дзе з'явілася — там і павінна быць. Але ў 1915 годзе, падчас Першай сусветнай вайны, пры набліжэнні фронту яе вымушана перавезлі ў Маскву. Неўзабаве адбылася рэвалюцыя, якая прынесла з сабой атэістычныя ідэі. Здавалася, што святыню дадому ніхто не верне і яна знікне ў кругазвароце бязбожніцтва.

— Вынаходлівы жыровіцкі архімандрыт Ціхан Шарапаў зрабіў мудра: самае дарагое паклаў у... слоік з варэннем і без праблем даставіў ікону ў манастыр.

Але колькі цудадзейных беларускіх ікон засталіся за мяжой ці зніклі бясследна? Дзясятак можна прыгадаць без падрыхтоўкі, а калі залезці ў гістарычныя дакументы і папрацаваць з адмысловай літаратурай, то высветлім, што іх было значна больш. Вяртанне на Радзіму — мэта недасягальная. Вось мы і аказаліся ў становішчы, калі беларускія прыходы вымушаныя набываць на замежных аўкцыёнах спісы са сваіх жа святыняў.

Як у XXI стагоддзі вяртаюць да жыцця XIX

— Красавіцкай ноччу 1863 года жыхары Жыровіц прачнуліся ад яскравага полымя, якое ахапіла два дамы паблізу абіцелі. Ва ўспамінах так і запісана: «Іскры валіліся на стары дах манастырскай гасцініцы і на дом з усімі прыбудовамі, які некалі належаў архіепіскапу М[іхаілу]. Дрэвы, якія абаранялі гэты дом, даўно згарэлі, плот таксама, палыхаў ужо і дах над калодзежам. На бяду народу сабралася шмат, але не было ніякага парадку. <...> Не бачылася ніякай надзеі адстаяць манастыр і яго храмы». Тады іераманах Мікалай узяў цудадзейную ікону Багародзіцы, абышоў дом архіепіскапа Міхаіла і рушыў праз увесь манастыр, чытаючы малітву. Услед за манахам вецер змяніў напрамак і агонь суцішыўся... Сёння мы з вамі стаім перад гэтым самым домам, які ўцалеў той ноччу, — расказвае протадыякан Георгій.

Немагчыма паверыць у тое, што драўлянай двухпавярховай пабудове, якая знаходзіцца акурат адразу за межамі манастыра, каля дзвюх соцень гадоў.

— Дакладная дата ўзвядзення пакуль невядомая. Мяркуем, што не пазней за 1830-я гады. Пры гэтым дом нядрэнна захаваўся, — клірык запрашае зазірнуць унутр. — Зірніце на сцены — старадаўняя дранка і каваныя цвікі. А якое масіўнае і трывалае дрэва! З беларускіх лясоў у наш час такое не выпішаш, толькі з Сібіры. Столь — скляпеністая. Цяпер за такую мала хто бярэцца. Усё гэта харастко адкрылася падчас рэканструкцыі, якую мы распачалі зусім нядаўна. Пасля вайны тут жылі звычайныя людзі, з часам дом прыйшоў у аварыйны стан. Вынік — жыльцоў рассялілі. Паўстала пытанне: прайсціся па ім бульдозерам ці захаваць. Дзякаваць Богу, абышлося! Інакш атрымалася б варварская сітуацыя, калі сядзіба перажыла пажары і войны, а мы сваімі ж рукамі яе знішчылі.

Галоўная каштоўнасць дома — тут жылі архіерэі. Пра гэта сведчаць пісьмовыя крыніцы. Вядома, што ў першай палове XIX стагоддзя менавіта гэты будынак лічыўся найлепшым у мястэчку. Балкон на другім паверсе надаваў рамантычнасці, а ў фруктовым садзе нярэдка можна было пачуць музыку: іграліся семінарысты і спявалі пеўчыя. Архіепіскап Міхаіл трымаў у доме калекцыю карцін, на якую прыходзілі паглядзець жыровіцкія госці. Цікава, што яна не была страчана, проста ўладыка распарадзіўся, каб пасля яго смерці прадметы мастацтва распрадалі на карысць Жыровіцкага жаночага вучылішча, якое ён заснаваў.

— Нават за сто гадоў дом не страціў свайго шарму. Разабраўшы новыя сцены, зробленыя апошнімі ўладальнікамі дома, атрымалася часткова ўзнавіць першапачатковую планіроўку, — дзеліцца протадыякан Георгій і аптымістычна зазначае: — Працы яшчэ непачаты край, але калі ўзяліся за справу, то абавязкова давядзём яе да канца. У планах — вярнуць былую прыгажосць архіерэйскаму доміку ў Жыровічах і заснаваць тут музей.

Далучыцца да добрай справы можаце і вы. Рэквізіты:

разліковы рахунак BY71AKBB30150038301434100000 філіял № 402 ААТ «ААБ Беларусбанк» у Ваўкавыску. BIC AKBBBY21402. УНН 500241964. Навагрудская епархія Беларускай Праваслаўнай Царквы з пазнакай «На аднаўленне архіерэйскага дома».

Ганна КУРАК, фота аўтара і Анатоля Клешчука.

Слонімскі раён.

Даведка

Свята-Успенскі мужчынскі стаўрапігіяльны манастыр у Жыровіцах заснаваны ў 1520 годзе менавіта на тым месцы, дзе з'явілася цудадзейная ікона Божай Маці. Сёння архітэктурны ансамбль уключае Яўленскую і Крыжаўзвіжанскую цэрквы, Успенскі сабор і прылеглы да яго зімовы Нікольскі храм, а таксама званіцу, будынак Мінскай духоўнай семінарыі, жылы манастырскі комплекс і іншыя пабудовы. Акрамя таго, непадалёк знаходзяцца драўляная Юр'еўская царква на могілках і дзве святыя крыніцы.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» 12 сентября 2019 г. в 11.30 на электронной торговой площадке «МИНСК—НЕДВИЖИМОСТЬ» (http://minskestate.by) проводит электронные торги № 1566373820149 по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске.
Предмет электронных торгов: право заключения договора аренды земельного участка сроком на 5 лет

№ предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь, га	Целевое назначение земельного участка / назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества	Начальная цена предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, рублей	Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	г. Минск, ул. Колесникова	500000000006009229	1,0000	для строительства объекта «Многофункциональный комплекс со встроенным паркингом по ул. Колесникова в г. Минске»/ земельный участок для размещения объектов иного назначения	253 243,80	37 900,00	10 153,83	проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: функциональное назначение земельного участка и его частей – многофункциональный комплекс со встроенным паркингом, состав объекта строительства – помещения административно-делового, торгово-бытового и культурно-развлекательного назначения, предприятие общепита (не менее 50 % общей площади здания), паркинг не менее 350 м/мест (до 50 % общей площади здания); показатели по вместимости объекта строительства – до 25000 кв. м общей площади
2	г. Минск, ул.Каменногорская	500000000006009231	3,3471	для строительства объекта «Многофункциональный общественный комплекс со встроенным паркингом по ул. Каменногорской в г. Минске» / земельный участок для размещения объектов иного назначения	944 608,19	141 600,00	13 294,82	проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: функциональное назначение земельного участка и его частей – многофункциональный общественный комплекс со встроенным паркингом по ул. Каменногорской в г. Минске, состав объекта строительства – помещения торгового, административно-делового, культурно-развлекательного назначения, предприятия общественного питания (не менее 50 % общей площади объекта), паркинг наземно-подземный общей вместимостью не менее 1020 м/мест (до 50 % общей площади объекта); показатели по вместимости объектов строительства – до 72000 м кв. общей площади
3	г. Минск в районе ул. Владислава Сырокомли	500000000003005252	1,3300	для строительства объекта общественно-коммунального назначения в районе ул. Владислава Сырокомли в г. Минске / земельный участок для размещения объектов иного назначения	362 256,75	54 300,00	10 243,40	проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами – объекты автосервиса (не более 50 %), предприятия торгово-бытового назначения, административные помещения; возмещение открытому акционерному обществу «Щомыслица» убытков сельскохозяйственного производства в сумме 1215,76 рубля с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения; возмещение потерь сельскохозяйственного производства в сумме 26 011,09 рубля с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения
4	г. Минск, ул. Налибокская	500000000006009217	1,3700	для строительства объекта «Многофункциональный физкультурно-оздоровительный комплекс со встроенным паркингом по ул. Налибокской» / земельный участок для размещения объектов иного назначения	346 944,01	52 000,00	11 020,93	проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: состав объекта строительства – помещения спортивного, физкультурного, лечебно-оздоровительного, бытового назначения, предприятие общественного питания до 100 мест – не менее 60 % общей площади здания, паркинг не менее 150 м/мест, показатели по вместимости объекта строительства – до 13700 кв. м общей площади

* Убытки и потери сельскохозяйственного производства подлежат пересчету с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения

Продавец: Минский городской исполнительный комитет, пр-т. Независимости 8, 220030, г. Минск, сайт: www.minsk.gov.by

Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки: коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефоны: (017) 2261672, 327-40-22, сайт: www.mgcn.by.

Порядок проведения электронных торгов: электронные торги проводятся в соответствии с **регламентом** информационной торговой системы ЭТП «МИНСК—НЕДВИЖИМОСТЬ» (далее – Регламент) с соблюдением требований Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 (далее – Положение).

Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на сайте ЭТП по электронному адресу **http://minskestate.by**, пройти аккредитацию на ЭТП, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

Задаток перечисляется на расчетный счет № BY34BPSB30121049710199330000 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, 220035, г. Минск, пр-т Машерова, д. 80, УНП 190398583, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению) не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах **– 09.09.2019 г.**

Дата и время начала проведения электронных торгов: **12 сентября 2019 года в 11.30** (по времени на сервере ЭТП «МИНСК–НЕДВИЖИМОСТЬ»).

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, выразивший согласие на приобретение земельного участка по начальной цене, увеличенной на 5 % (претендент на покупку), в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах электронных торгов либо признания торгов несостоявшимися, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся, заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона **договор аренды земельного участка сроком на 5 лет**.

